№ 27 (529) 26 ліпеня 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднoўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## У НУМАРЫ

**Абы не на расейскай сыравіне**

Прыватызацыі цэмэнтавых заводаў ня будзе. Мадэрнізацыю вытворчасьці бярэ на сябе ўрад. Новыя тэхналёгіі будуць кітайскімі, заводы пяройдуць з газу на вугаль. Гаспадарка за тыдзень — **старонка 8**.

**«Басовішча»**

Музыкаў звальняюць за ўдзел у беларускім рок-фэстывалі. **Старонка 7.**

**Пастка для крата**

Купленыя матчы: Валеры Шанталосаў абʼяўлены ў вышук. **Старонка 6.**

**27 ліпеня 1990 году была прынятая Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі. За панядзелак-сераду ў сталіцы было арыштавана каля 60 юнакоў і дзяўчат, якія распаўсюджвалі ўлёткі да памятнай даты.**




# «Пастухі, а не чэкісты»

Барацьба сілавых ведамстваў за ўплыў вылілася ў публічную дыскрэдытацыю КДБ. **Старонка 3.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ




# Купала ў кожны дом

Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: sjargyk@me.by

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Як, па-Вашаму, шпіёнаў якой краіны дзейнічае ў Беларусі найбольш?

| | |
|---|---|
| Польшчы | 21 (5,5%) |
| Расеі | 186 (48,4%) |
| ЗША | 4 (1,0%) |
| Гандурасу | 77 (20,1%) |
| Беларускай Народнай Рэспублікі | 96 (25.0%) |

Усяго прагаласавала 384

### «Акіян Эльзы» праедзе па Беларусі зь бясплатнымі канцэртамі

Сотавы апэратар Velcom ладзіць вялікую музычную акцыю, у якой паўдзельнічаюць зоркі ўкраінскай і беларускай эстрады. Канцэрты пройдуць у розных гарадах з 28 ліпеня да 2 верасьня. Хэдлайнэрам фэстаў будзе знакаміты ўкраінскі гурт «Акіян Эльзы». Поўны склад удзельнікаў вызначыцца праз смс–галасаваньне. Velcom выставіў на галасаваньне Пятра Ялфімава, Топлес, Мэры Попінс, Аляксея Хлястова, Карыяну, Нэма, J–Морс і Крамбамбулю. «Абанэнты Velcom могуць прагаласаваць за той гурт, які б хацелі ўбачыць у сваім горадзе. На сайце кампаніі ёсьць сьпіс, адкуль трэба выбіраць, а таксама правілы, як гэта зрабіць».

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Наёмнікі

За чысткай КДБ у ценю засталося, хто прызначаны наступнікам Жадобіна ў Службе аховы прэзыдэнта.

Старшынём Камітэту дзяржбясьпекі прызначаны генэрал-маёр Юры Жадобін, які займаў да таго пасаду начальніка Службы бясьпекі прэзыдэнта. Замест яго начальнікам Службы бясьпекі кіраўніка дзяржавы назначаны падпалкоўнік Андрэй Уцюрын, які займаў да гэтага часу пасаду начальніка ўпраўленьня асабістай аховы гэтай структуры.

Зьвяртаюць увагу дзьве акалічнасьці. Па-першае, былыя кіраўнікі асабістай аховы прэзыдэнта займаюць пасьля найважнейшыя пасады ў дзяржаве (старшыні КДБ, кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, міністра ўнутраных справаў). Такога няма ні ў адной дэмакратычнай эўрапейскай краіне.

Па-другое, на пасаду кіраўніка Службы аховы прэзыдэнта падбіраюцца пераважна людзі, якія нарадзіліся не ў Беларусі і скончалі школу, узгадоўваліся як асобы не ў Беларусі (Ерын, Навумаў, Жадобін, цяпер, імаверна, Уцюрын, біяграфія якога пакуль невядомая; за выняткам Нявыгласа). Такога таксама няма ні ў аднай іншай эўрапейскай краіне, і гэта нагадвае фэадальную эпоху. Гэта адлюстроўвае як інстытуцыйны недавер рэжыму, так і ягоную палітычную сутнасьць.

Тэма далікатная, але ня можна яе не кранаць. Вельмі добра, калі асобы родам не зь Беларусі маюць роўныя шанцы. Але калі ў кіраўніка аховы падбіраюцца такія асобы — гэта ня менш паказальна, чым той факт, што Служба аховы ператвараецца ў галоўную кузьню кіраўнічых кадраў.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКЦЫІ

# Набудавалі аграгарадкоў

...а каму ў іх жыць? — скозь разважаюць людзі. «Засяляюць усякіх перакаціполе», — казалі ў Вішневе.

Дзяржаўныя грошы, як у прорву, інвэстуюцца ў парабкаў, а не ў гаспадароў. Гэта значыць — без надзеі на вяртаньне. Затое стаяць платы для красаты. Скрозь гіганцкія сумы марнуюцца на паказуху.

А ў Крэве няма грошай, каб хоць бы закансэрваваць унікальны замак, шыльду культурную напісаць, што гэта такое. Затое ў сярэдзіне вёскі — сьвежазбудаваны каскад ставоў. Бэтон, камяні. І смурод: вада цьвіце. Не разьлічылі, што ручай заслабы. Але добраўпарадкаваньне праведзенае.

У Гальшанах працягвае ціха гінуць прыўкрасны палац, а рашэньне аб рэстаўрацыі кляштара пад музэй, прынятае ў 1982 годзе, дагэтуль не пачало выконвацца. Затое разьбілі «гарадзкія» дарожкі і фэрму пабялілі.

У Мядзеле да экалягічнага форуму на набярэжнай высадзілі тысячу туяў. Старыя дрэвы высякалі — іх у пляне ня значылася. А каб паліваць тыя туі, фінансаваньня ўжо няма. Таму з тысячы туяў 950 засохла. А каму баліць? Грошы асвоілі, да прыезду начальства ўсё было пекна.

Усё інакш там, дзе ініцыятыва ідзе зьнізу, а ня зьверху. Як у Гервятах, дзе мясцовая каталіцкая парафія перарабіла цьвінтар і пляц мястэчка ў парк скульптураў, праўдзівы батанічны сад з 2500 відамі расьлінаў (**рэпартаж чытайце на старонцы 19**). Заяжджаеш у такія Гервяты, і нібы з СССР трапляеш у Беларусь…

# «Пастухі, а не чэкісты»

Аляксандар Лукашэнка громіць КДБ.

Што стала прычынай разгромнай крытыкі КДБ, што прагучала ў чацьвер? Стужкі Макара? Скандальны напад на Зянона Ломаця на мінулым тыдні? Жаданьне аслабіць і дыскрэдытаваць структуру, якая заставалася свайго роду дзяржавай у дзяржаве ў сцэнтраванай на прэзыдэнта сыстэме? Факт застаецца фактам: Лукашэнка паддаў Камітэт зьнішчальнай крытыцы. З чэкістаў вы ператварыліся ў пастухоў, сказаў у твар кадэбістам Лукашэнка. І загадаў трансьляваць гэта на ўсю краіну.

Чуткі пра адстаўку Сухарэнкі хадзілі даўно, таму выпадак з Ломацем, напэўна, стаў толькі зручнай нагодай. «Іншых цэнтраў сілы я не пацярплю», — заявіў Аляксандар Лукашэнка кагэбістам.

Нагадаем, што ў мінулы чацьвер, роўна ў той дзень, калі КДБ трыюмфальна абвесьціла пра выкрыцьцё цэлай шпіёнскай сеткі, у Магілёве невядомыя зьбілі старшыню Камітэту дзяржкантролю Зянона Ломаця. Больш за тое, тыя невядомыя былі пераапранутыя ў міліцыянтаў. Зьявіліся чуткі, што гэта былі супрацоўнікі КДБ на чале з афіцэрам Рады Бясьпекі.

Выкарыстоўваючы як нагоду прадстаўленьне на пасадзе новага старшыні Камітэту, генэрал-маёра Юр’я Жадобіна, былога начальніка службы аховы прэзыдэнта, Аляксандар Лукашэнка рэзка скрытыкаваў усё кіраўніцтва КДБ. «На ніжэйшых узроўнях ёсьць сумленныя людзі, але гэта не датычыць тых, хто сядзіць у гэтай залі».

Кіраўнік дзяржавы ўскосна пацьвердзіў вэрсію пра канфлікт паміж КДБ і Міністэрствам унутраных справаў.

«Ужо сёньня на пэўных сайтах у інтэрнэце, розныя жоўтыя мэдыі мусоляць факты вашай супрацьпраўнай дзейнасьці. Гэта тычыцца і старшыні Дзяржканролю Зянона Ломаця, і іншага. Мяркую, у межах крымінальнай справы генэральны пракурор, цяперашняе кіраўніцтва КДБ і МУС разьбяруцца», – сказаў Аляксандар Лукашэнка.

Ён адкрыта прызнаў «крышаваньне» камэрцыйных структураў сілавікамі і ўтойваньне інфармацыі аб карупцыі. Ён гаварыў аб тым, што працаўладкаваньне ў КДБ адбываецца паводле знаёмства і кумаўства. Ён заявіў пра няздольнасьць захоўваць сакрэты.

«Апошні час выявілася тэндэнцыя да падзеньня арганізаванасьці й дысцыпліны, а таксама да зьніжэньня ўзроўню на ўсіх кірунках дзейнасьці КДБ. У шэрагу выпадкаў гэта прывяло да адкрытых правалаў».

Ад новага старшыні КДБ Лукашэнка запатрабаваў «за год вычысьціць камітэт ад тых, хто заседзеўся».

Раней на афіцыйным узроўні заўсёды казалі, што ніякага канфлікту паміж сілавікамі няма – там проста «пазбаўляюцца ад несумленных супрацоўнікаў».

Не знайшла пацьверджаньня вэрсія, што Аляксандар Лукашэнка зьняў Сьцяпана Сухарэнку за сумнеўнае выкрыцьцё польскіх шпіёнаў. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў контравыведнікам за «гэтую цудоўную працу», аднак назваў яе ўсяго «прабліскам».

**Мікола Бугай**

# Братавая Сухарэнкі: «У таго, хто яго звольніў, няма ні сэрца, нічога»

Пэўны час хадзілі чуткі, запушчаныя інтэрнэт-выданьнем «Беларускі партызан», што Сухарэнку й Дземянцея арыштавалі. Аднак журналісты «Народнай волі» адшукалі генэрала ў матчынай хаце, што ў вёсцы Здудзічы Сьветлагорскага раёну. Тамака ён адпачывае зь сям’ёй. Сьцяпан Сухарэнка не адмовіўся ад інтэрвію.

Апальны кадэбіст заявіў у ім, што працягвае лічыць сябе чалавекам прэзыдэнта і гатовы працаваць на любой пасадзе, якую яму прапануюць.

У той жа час Сухарэнка прызнаў, што за ім назіраюць. Калі прыехалі журналісты, то побач з домам стаяла нейкая машына з антэнамі, кажа журналістка «Народнай волі» Марына Коктыш, якая наведвала Здудзічы.

«Ён сам зьвярнуў на яе ўвагу, сказаў, што гэтая машына зьявілася незадоўга да нашага прыезду. Потым, калі мы прыехалі й пачалі размаўляць, там яшчэ праехала машына, спынілася за некалькі мэтраў да гэтага дому і вельмі так павольна праехала побач з намі, паглядзелі два хлопцы адтуль».

Сваякі зь вёскі Здудзічы не прызнаваліся падчас размовы па тэлефоне, што там быў Сьцяпан Сухарэнка. Жонка яго брата, які памёр восем гадоў таму, Настасься Іванаўна так выказалася адносна звальненьня сваяка з пасады шэфа КДБ:

«Проста шкада чалавека. Я лічу, што ў таго, хто яго звольніў, няма ні сэрца, нічога на сьвеце. Думаеце, прыемна слухаць родным вось такое?! І ведаць, што чалавек аддаў усё сваё жыцьцё, усё сваё здароўе. Вывучыўся, вышкрабся, як кажуць. Дык вось, прыемна?

Я ўжо сама захварэла, проста мне яго як чалавека шкада. І ведаю, што такіх людзей пашукаць трэба. Вельмі непрыемна і нядобра вось такое слухаць. Гэта так вось проста чалавека ўтапіць, раздушыць, вось і ўсё.



NV–ONLINE.INFO

**Калі прыехалі журналісты, Сьцяпан Сухарэнка акурат зьбіраўся на рыбу.**

Ну, ведаеце, дзякуй Богу, што жывы. І каб Бог даў яму здароўя. Калі чалавек захоча пражыць, ён пражыве. У любым месцы будзе працаваць і пражыве».

**МБ; інф. радыё «Свабода»**

Чуткі пра звальненьне старшыні КДБ Сьцяпана Сухарэнкі хадзілі даўно, называлася і прозьвішча пераемніка — Юры Жадобін.

# КДБ узначаліў «непрафэсійны чэкіст»

У аўторак, 17 ліпеня, Аляксандар Лукашэнка падпісаў указ аб вызваленьні ад займаных пасадаў старшыні КДБ генэрал-лейтэнанта Сьцяпана Сухарэнкі і ягонага першага намесьніка Васіля Дземянцея, з трактоўкай «у сувязі зь пераводам на іншую працу». Новым старшынём КДБ, як і прагназавалася, стаў начальнік Службы бясьпекі прэзыдэнта Юры Жадобін.

«Новаму кіраўніцтву КДБ даручана ў найбольш сьціслыя тэрміны ўнесьці прэзыдэнту прапановы пра кадравае ўмацаваньне КДБ», — піша БелТА.

Юры Жадобін нарадзіўся ў 1954 г. ва ўкраінскім Днепрапятроўску (Сухарэнка ў Сьветлагорскім раёне). Вучыўся ў Казанскім танкавым вучылішчы, а таксама ў Маскоўскай Ваеннай акадэміі бранетанкавых войскаў. Ягоны прафэсійны рост быў зьвязаны з кар’ерай іншага танкіста — экс-міністра Юр’я Сівакова. З 1990 г. Жадобін быў на камандных пасадах у сыстэме грамадзянскай абароны Беларусі. З 1999 г. — намесьнік міністра ўнутраных справаў, камандуючы ўнутранымі войскамі. Зь верасьня 2003 году займаў пасаду начальніка Службы бясьпекі прэзыдэнта.

Падпалкоўнік КДБ у адстаўцы Валеры Костка наступным чынам камэнтуе кадравыя перастаноўкі ў спэцслужбах: «Зь сілавых ведамстваў спрабуюць прыбраць людзей, якія становяцца незалежнымі фігурамі. Так было з Паўлоўскім [старшыня Дзяржаўнага камітэту памежных войскаў], цяпер — з Сухарэнкам. Не зьдзіўлюся, калі наступны на чарзе Шпілеўскі [старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэту]. Сухарэнка быў чалавекам Віктара Шэймана, таму яго звальненьне і звальненьне Дамашкевіча ўзмацняюць пазыцыі Віктара Лукашэнкі. Мяне ніколі не захапляла постаць Сухарэнкі, але, баюся, што з прыходам Жадобіна КДБ канчаткова ператворыцца ў «ахранку», якая будзе ахоўваць інтарэсы толькі адной асобы».

Палітоляг Аляксандар Класкоўскі мяркуе, што новыя прызначэньні ў КДБ зьвязаныя зь няўпэўненым становішчам, у якім апынуліся беларускія ўлады.

«Гэта сьведчыць пра тое, што наверсе відавочна нэрвуюцца», — кажа Класкоўскі.

Менавіта з падачы Сьцяпана Сухарэнкі ў сьнежні 2005 году палата прадстаўнікоў прыняла зьмены да крымінальнага кодэксу. Менавіта тады быў прыняты артыкул 193, які прадугледжвае да двух гадоў зьняволеньня за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

За апошнія два гады каля дзесяці актывістаў апазыцыі былі асуджаныя па 193-м артыкуле. Ахвярай паправак быў і Мікола Астрэйка, які атрымаў два гады зьняволеньня за ўдзел у арганізацыі «Партнёрства», але быў вызвалены датэрмінова.

«Перакананы, што адстаўка Сухарэнкі аслабіць КДБ, — кажа ён. — Увогуле ж, з Камітэту дзяржаўнай бясьпекі гэтая структура паступова ператвараецца ў Камітэт бясьпекі дзяржаўных асоб. Што тычыць асабіста маіх уражаньняў, то навіна для мяне, бясспрэчна, добрая».

Відаць, бліжэйшым часам Сьцяпан Сухарэнка страціць і пасаду старшыні фэдэрацыі біятлёну, звычайнае гэтае крэсла перадаецца ад аднаго кіраўніка КДБ да іншага. Да Сухарэнкі старшынямі фэдэрацыі біятлёну былі Ўладзімер Мацкевіч і Леанід Ерын.

**Зьміцер Панкавец**

# Дзевяць высноваў зь ператраскі КДБ

**Форма ўлады** ў Беларусі такая, што ёй патрэбныя пэрыядычныя ператраскі кіраўнічых структураў. Каб ня даць утварыцца устойлівым сувязям і групоўкам.

**Лукашэнка да канца** не давярае КДБ: і Мацкевіч, і Ерын, і цяпер Сухарэнка скончылі сваё кіраўніцтва ў няласцы.

**Служба аховы** прэзыдэнта зрабілася галоўнай кузьняй кадраў для кіраўнічых структураў. Улада абапіраецца на сілу, і асобаў, асабіста правераных.

**Сыстэма ўлады** далёкая ад стабільнасьці. На кожны кадравы посьпех прыпадае кадравы правал.

**Паміж рознымі** сілавымі структурамі ідзе барацьба за кантроль над уласнасьцю. У ёй не цырымоняцца і не перабіраюць у сродках. Гэта значыць, што сілавікі лічаць непазьбежным пераход да намэнклятурнага капіталізму, кшталту таго, што ўзьнік у Расеі ці Казахстане. Верх выкарыстоўвае гэта, каб падзяляць і ўладарыць, але непакоіцца тым, што гэтае змаганьне зьніжае эфэктыўнасьць улады.

**Чаму можна** займацца палітычнымі маніпуляцыямі, але няможна — эканамічнымі маніпуляцыямі? — думаюць сабе чыноўнікі. Бацькі першага правакуюць другое.

**Калі *такое*** адбываецца з кіраўніком Камітэту дзяржаўнага кантролю, дык што гаварыць пра звычайнага беларуса?

**Сухарэнка пасьля** адстаўкі, а Жадобін пасьля прызначэньня свае першыя інтэрвію далі апазыцыйнаму выданьню.

**Лукашэнка наўмысна** вынес сьмецьце з хаты. Значыць, сваім выступам дабіваўся дыскрэдытацыі КДБ як такога. Між тым КДБ — гэта частка савецкай спадчыны... Захад адчытаў бы перайменаваньне КДБ як значны сыгнал.

**Барыс Тумар**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Ці слушна робіць Лукашэнка, дыскрэдытуючы і аслабляючы КДБ?**

| | |
|---|---|
| слушна | 30 (14,4 %) |
| няслушна | 10 (4,8 %) |
| гэта таўкатня павукоў у слоіку | 158 (75,6 %) |
| гэта проста змаганьне з карупцыяй | 11 (5,3 %) |

Усяго прагаласавала: 209

# Севярынца і Шэіна асудзілі на 15 сутак

Спэцслужбы спрабуюць сарваць акцыі 27 ліпеня.

У аўторак у судзе Фрунзэнскага раёну Менску прайшлі суды над затрыманымі ў панядзелак лідэрамі хрысьціянска-дэмакратычнага руху Паўлам Севярынцам і Аляксеем Шэіным.

Шэіна судзілі першым, ён атрымаў 15 сутак адміністрацыйнага арышту. Столькі ж адмерылі і Паўлу Севярынцу. Хлопцам інкрымінавалі арт. 23.24 новага Адміністрацыйнага кодэксу: заклікі да правядзеньня несанкцыянаванай акцыі.

П.Севярынец і А.Шэін былі затрыманыя ў панядзелак а 20.30 на станцыі мэтро «Пушкінская» па падазрэньні ў «дачыненьні да нейкага кватэрнага крадзяжу».

Падчас агляду асабістых рэчаў у актывістаў былі знойдзеныя 150 асобнікаў агітацыйных матэрыялаў з інфармацыяй аб правядзеньні апазыцыйнымі сіламі 27 ліпеня акцый з нагоды гадавіны прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусь.

Дарэчы, якраз у аўторак Севярынец і Шэін павінныя былі сустрэцца з пасламі Эўрасаюзу.

Улады спрабуюць сарваць акцыі апазыцыі 27 ліпеня, на Дзень прыняцьця Дэклярацыі аб сувэрэнітэце. За панядзелак-сераду супрацоўнікі КДБ і міліцыі арыштавалі ў сталіцы каля 60 юнакоў і дзяўчат, што расклейвалі ўлёткі.

ЗП



PHOTO.BYMEDIA.NET

Павал Севярынец (зьлева) і Аляксей Шэін.

# На 60-годзьдзе Мілінкевіч заводзіць сабе блог

Асабісты блог лідэра Руху «За Свабоду» зьявіцца ў другой палове жніўня.

Месьціцца ён будзе на сайце палітыка. Зьменіцца і сам дызайн і начыненьне сайту. Паболее відэа і фотаматэрыялаў. Пра гэта паведаміла сакратарка палітыка Юлія Коцкая.

Дарэчы, 25 ліпеня Аляксандру Мілінкевічу споўнілася 60 гадоў. Павіншаваць палітыка і навукоўца з круглай датай можна праз сайт nn.by, у адпаведным артыкуле.

АГ



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Перад Днём нараджэньня Мілінкевіч наведаў беларускі рок-фэстываль «Басовішча».

# Пастка для крата

Узбуджаная крымінальная справа супраць былога брамніка нацыянальнай зборнай па футболе Валер'я Шанталосава.

Сталі вядомыя новыя падрабязнасьці ў справе матчаў па дамоўленасьці нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе.

Яшчэ ў ліпені 2005 г. Рэспубліканская пракуратура завяла крымінальную справу па артыкуле 253 КК «Подкуп удзельнікаў прафэсійных спаборніцтваў». Асновай для завядзеньня крымінальнай справы стаў артыкул у найбольшай беларускай спартовай газэце «Прессбол» «Апэрацыя «Крот».

У артыкуле гаварылася, што былы футбаліст зборнай Ш. спрабаваў купіць у гульцоў матчы нацыянальнай каманды з чэхамі і малдаванамі. Людзі, якія троху разьбіраюцца ў футболе, практычна адразу ідэнтыфікавалі футбаліста Ш., але ягонае прозьвішча нельга было разгалошваць праз таямніцу сьледзтва.

22 ліпеня афіцыйны друкаваны ворган Міністэрства ўнутраных справаў газэта «На страже» надрукавала інтэрвію на гэтую тэму з начальнікам сьледчага ўпраўленьня папярэдняга расьсьледаваньня ГУУС Менгарвыканкаму Генадзем Казакевічам. Сьледчы і назваў прозьвішча футбаліста. Як і



прагназавалася, ім аказаўся былы брамнік нацыянальнай зборнай Валеры Шанталосаў **(на фота)**. У свой час ён правёў 26 матчаў за зборную краіны, а таксама зьяўляецца самым «сухім» галкіпэрам у гісторыі Беларусі, Шанталосаў не прапускаў галоў у 143 гульнях.

Генадзь Казакевіч кажа, што ў 2003 г. перад гульнямі з чэхамі і малдаванамі Шанталосаў выходзіў на тагачаснага варатара зборнай з прапановай забясьпечыць патрэбны вынік (у тых матчах за зборную ў браме стаяў Васіль Хамутоўскі). За гэта галкіперу прапаноўвалася некалькі тысяч даляраў. Урэшце матчы скончыліся з патрэбным для «кратоў» вынікам, але ніякіх доказаў таго, што брамнік насамрэч браў грошы ад Шанталосава няма. Па словах сьледчага, у гэтай справе фігуруе яшчэ адзін расейскі журналіст, але ягонае імя пакуль не называецца.

26 красавіка Валеры Шанталосаў быў абʼяўлены ў крымінальны вышук. Як толькі фігурант справы будзе знойдзены, справу накіруюць у суд.

Цяпер Шанталосаў нібыта працуе трэнэрам брамнікаў у першалігавай расейскай «Сібіры».

**Зьміцер Панкавец**

# КДБ ня будзе?

«Белорусский партизан», які мае крыніцы ў Міністэрстве ўнутраных справаў, паведаміў, што разглядаецца магчымасьць зьліцьця КДБ зь Міністэрствам унутраных спраў. Наватвор можа атрымаць назву Дэпартамэнт нацыянальнай бясьпекі.

**ЗП**

# Індыкатар не працуе

Міністэрства юстыцыі Беларусі адмовіла ў рэгістрацыі рэспубліканскаму грамадзкаму аб'яднаньню «Рух «За Свабоду».

Афіцыйную адмову Мін'юсту замоўнікі атрымалі 21 ліпеня. У дакумэнце ўтрымліваюцца прэтэнзіі да фармулёўкі статуту РГА. Паводле слоў А.Кавальца, прэтэнзіі гэтыя «абсалютна не абгрунтаваныя і самі сабе супярэчаць».

Рух «За Свабоду» мае дабівацца рэгістрацыі ў судовым парадку, нават разумеючы, што прававым шляхам дабіцца тут нечага цяжка.

**МБ**

# Створаны аргкамітэт сьвяткаваньня 90-годзьдзя БНР

Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» выступіла з ініцыятывай заснаваньня Грамадзкага арганізацыйнага камітэту дзеля годнага сьвяткаваньня 90-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Наступны, 2008 год, юбілейны для беларускай дзяржаўнасьці. 25 Сакавіка 1918 году была абвешчаная незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі. Ад тае пары нацыянальны рух сьвяткуе гэты дзень як дату адраджэньня дзяржаўніцкае волі беларусаў.

19 ліпеня адбылося першае пасяджэнне Аргкамітэту. Ганаровай старшынёй яго пагадзілася стаць старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла. У Аргкамітэт увайшлі грамадзкія і культурныя дзеячы зь Беларусі і замежжа, кіраўнікі беларускіх суполак з розных краінаў сьвету. Сустаршынямі Аргкамітэту абраныя паэт Генадзь Бураўкін, акадэмік Радзім Гарэцкі, мастак Аляксей Марачкін.

Аргкамітэт лічыць, што юбілейныя мерапрыемствы павінныя стаць добрай нагодай, каб адзначыць дзяржаватворную значнасьць Акту абвяшчэньня незалежнасьці 25 Сакавіка 1918 г.

Падрыхтоўка да юбілею і яго сьвяткаваньне павінныя стаць падмуркам яднаньня розных рухаў, партый, згуртаваньняў, арганізацый незалежна ад палітычнай арыентацыі пры ўмове прызнаньня прыярытэтамі дзяржаўнага будаўніцтва нацыятворных пытаньняў мовы, гістарычнай сымболікі, свабоды і дэмакратыі.

Аргкамітэт на сваім першым пасяджэньні зьвярнуўся да ўсіх партый, рухаў, арганізацый, дзеячаў з прапановай вылучыць сваіх прадстаўнікоў у Аргкамітэт.

Таксама Аргкамітэт прапанаваў абвесьціць 2008 год Годам беларускай дзяржаўнасьці.

**Прэс-служба ЗБС «Бацькаўшчына»**

# Музыкаў звальняюць з працы за ўдзел у «Басовішчы»

Пра гэта паведамілі ўдзельнікам гурту «Сьцяна» — вакалісту Паўлу Прохараву і барабаншчыку Аляксею Кузьняцову. Яны працуюць гукарэжысёрамі на Берасьцейскай студыі тэлебачаньня. У той жа сытуацыі і гітарыст бярозаўскага гурту «BN» Максім Літвінец. Ён працаваў інжынэрам у калгасе «Прамень».

Прычына ў тым, што музыкі не атрымалі дазвол пакінуць працу 19—20 ліпеня, а на першы дзень якраз быў заплянаваны выступ «Сьцяны» на «Басовішчы». І хлопцы зьехалі на фэстываль без дазволу адміністрацыі. А па вяртаньні даведаліся, што з 8 жніўня іх звальняюць па артыкуле 48 п.5 Працоўнага кодэксу «за прагулы, якія пацягнулі за сабой парушэньні працоўнай дысцыпліны».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ
**Грае «Сьцяна».**

— Адмова адпусьціць нас была нічым не матываваная. Мы знайшлі замену на гэтыя два дні, але дырэкцыя студыі ўсё роўна адмовіла. «Басовішча» мы проста не маглі прапусьціць, таму і вырашылі зьехаць без дазволу, — сказаў Аляксей Кузьняцоў.

Супрацоўнікі студыі напісалі калектыўны зварот да адміністрацыі з просьбай не звальняць хлопцаў. Адказу на яго пакуль няма.

У гэткай жа сытуацыі апынуўся і гітарыст бярозаўскага гурту «BN» Максім Літвінец, які працуе інжынэрам у філіяле калгасу «Прамень». Музыка напісаў заяву, каб узяць два дні за свой кошт, але згоду дырэкцыі не атрымаў. Пасьля вяртаньня даведаўся, што з 24 ліпеня звольнены. Да таго ж, ён мусіць выплаціць каля 4,5 тысячаў эўра, бо, маўляў, не адпрацаваў патрэбныя два гады пасьля разьмеркаваньня.

**Андрэй Клімус, Радыё «Рацыя»**

**Рэпартаж з «Басовішча» — старонка 10.**

# Гальшанскі замак не адбудуюць нават у мініятуры

Пабудову міні-копіі Гальшанскага замку задумаў і жыхар мястэчка і сталічныя студэнты-архітэктары. «Няможна!» — сказалі мясцовыя ўлады.



Пабудова зьменшанай мадэлі славутага тамтэйшага замку магла б прывабіць цікаўных. Але студэнты зь Менску і Берасьця не пасьпелі нават і распачаць загадзя сплянаваную будоўлю — улады іх тэрмінова выслалі. Гэта адбылося ў другой палове дня 19 ліпеня.

Запрасіў у Гальшаны студэнтаў Пятро Явідовіч, які набыў у мястэчку хату. Ня толькі каб жыць тутака зь сям'ёю, але і каб стварыць музэй гадзіньнікаў, якія ён рамантаваў раней, маючы майстэрню ў Ашмянах.

Ягоная мара — пабудаваць аграсядзібу, каб туды прыязджалі на адпачынак турысты. У сувязі з гэтым яму прыйшла ідэя стварыць у сябе на падворку Гальшанскі замак у зьменшаным выглядзе. Ад самога ж замку засталіся толькі руіны, якія працягваюць разбурацца.

Моладзь з асацыяцыі студэнтаў-архітэктараў спадар Явідовіч запрасіў на ўласны кошт. Прыехалі трыццаць чалавек. Паставілі намёты, ён наладзіў харчаваньне. Аднак тут умомант зьявіліся праваяральшчыкі, пачынаючы з памежных войскаў і сканчаючы санэпідслужбай.

Санслужба ў асобе галоўдоктара Аляксандра Вайкуля і прадстаўнік МНС абвесьцілі, што летніка тут быць ня можа. Маўляў, трэ было атрымаць загадзя згоду ўладаў.

Пятру Явідовічу крыўдна: на любой будоўлі людзі жывуць у спэцыфічных умовах, абеды ім прывозяць, а ён гатаваў і мыў посуд у стацыянарных умовах.

**Алесь Каралёў, bulletinonline.org**

## Таварыства аховы помнікаў: Трагедыі ў продажы помнікаў архітэктуры расейскім бізнэсоўцам няма

Старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч ня бачыць трагедыі ў продажы айчынных помнікаў архітэктуры расійскім бізнэсоўцам.

На просьбу агенцтва БелаПАН ён адкамэнтаваў магчымы продаж расійскім прадпрымальнікам палацу й парк ў Красках (Ваўкавыскі раён) («НН», №26).

Унікальная сядзіба — помнік рэспубліканскага значэньня. «Гэта значыць, што ўсе работы па рэстаўрацыі і прыстасаваньні будынку будуць праводзіцца пад кантролем грамадзкасьці», — спадзяецца А.Астаповіч. «Сядзібу ў Маскву ня вывезеш», — кажа ён. «Няма шанцаў знайсьці айчыннага прадпрымальніка, які б сядзібу набыў».

**Марат Гаравы, БелаПАН**

# Абы не на расейскай сыравіне

Прыватызацыі цэментавых заводаў ня будзе. Мадэрнізацыю вытворчасьці бярэ на сябе ўрад. Новыя тэхналёгіі будуць кітайскімі, заводы пяройдуць з газу на вугаль.

Беларусь возьме $600 мільёнаў крэдытаў на мадэрнізацыю цэмэнтавых заводаў, каб павялічыць штогадовы аб'ём вытворчасьці цэмэнту з 3,7 млн. т у 2006 годзе да 9,5 млн. т да 2011 года. А.Лукашэнка таксама арыентаваў урад на разбудову тых галінаў, у якіх Беларусь не залежыць ад расейскай сыравіны. «Навошта мы будзем тут будаваць тое, для чаго заўтра давядзецца закупляць сыравіну? Нам не патрэбныя такія вытворчасьці, праз якія мы зноў трапім у залежнасьць».

Ад 1996 году працуе Беларускі цэмэнтавы завод, пазьней увайшлі ў працу дзьве новыя печы ў Краснасельскім. У выніку выраб цэмэнту ў Беларусі вырас удвая. Аднак на існых лініях ужо немагчыма забясьпечыць росту вытворчасьці.

Прэм'ер Сяргей Сідорскі прадставіў на нарадзе ў прэзыдэнтуры праграму разьвіцьця цэмэнтавай галіны на 2007—2011 гады.

Плянуецца, што Беларусь у 2011 годзе будзе спажываць амаль 5 млн. т цэмэнту ў год і прыкладна столькі ж экспартаваць. Спажыўцом будзе найперш будоўля новай АЭС. Пакупнікамі ж застануцца Расія, Польшча.

Гаворачы пра сыравінныя запасы, С.Сідорскі падкрэсьліў, што ўсе беларускія прадпрыемствы (Крычаў, Касьцюковічы, Краснасельскі) забясьпечаныя сыравінай з тамтэйшых радовішчаў на дзесяцігодзьдзі.

Зацікаўленасьць ва ўдзеле ў цэмэнтавай галіне выказалі больш як 10 замежных інвэстараў. Аднак ніхто зь іх не прапанаваў варыянтаў, якія б зацікавілі беларускі ўрад. Таму мяркуецца пакінуць прадпрыемствы ў дзяржаўным кіраваньні.

Пастаўшчыком новых ліній па вытворчасьці цэмэнту стане кітайская карпарацыя. Яе абсталяваньне мае прымальную цану.

На рэалізацыю праекту мяркуецца задзейнічаць замежныя крэдытныя рэсурсы ў аб'ёме да $600 млн. Акупнасьць праекту — 4 гады. Крэдытныя рэсурсы можна будзе атрымаць ужо ў лютым 2008 года.

А.Лукашэнка на нарадзе, у сваю чаргу, запатрабаваў адысьці ад залежнасці па газу і перавесьці заводы на выкарыстаньне вугалю. У Заходняй Эўропе такія прадпрыемствы ў 80% выпадкаў працуюць менавіта на вугалі.

А.Лукашэнка знайшоў і спосаб пакінуць надзею замежным прэтэндэнтам на цэмэнтавую галіну. Ён паставіў задачу актывізаваць дасьледаваньне новых радовішчаў з мэтай узьвядзеньня ў бліжэйшай пэрспэктыве трох новых цэмэнтавых заводаў недзяржаўнай формы ўласнасьці з удзелам замежных інвэстараў.

А.Лукашэнка адзначыў, што пры будаўніцтве новых прадпрыемстваў у краіне неабходна арыентаваць іх работу на тую сыравіну, якая ёсьць у Беларусі. «Нам не патрэбныя такія вытворчасьці, праз якія мы зноў трапім у залежнасьць. Беларусі неабходна забясьпечыць прыярытэтнае разьвіцьцё галін і вытворчасьцей, якія працуюць на ўласнай сыравіне. Гэта аксіёма».

**Мікола Бугай; інф.БелТА**

# Пабудову «Менск-Сіці» аддаюць «Ітэры»

Лужкоў ужо атрымаў падрад на пабудову прэстыжнага кварталу на праспэкце Машэрава. Цяпер выгадны кантракт дастанецца яшчэ адной блізкай да лукашэнкаўцаў расейскай структуры.

Аляксандар Лукашэнка 24 ліпеня правёў нараду, на якой абмяркоўваліся праекты забудовы тэрыторыі аэрапорту «Менск-1» і раёну каля Нацыянальнай бібліятэкі.

Быў узгоднены праект забудовы, прапанаваны расейскім холдынгам «Ітэра Інвэст». Гэта можа быць плата за палітычную і эканамічную падтрымку беларускай адміністрацыі бізнэс-коламі, блізкіх да мэра Масквы Лужкова і кіраўніка «Ітэры» Макарава.

**МБ**

# 40 % падаткаў краіны зьбіраецца ў сталіцы

Па выніках працы за першае паўгодзьдзе больш за 38% даходаў дзяржбюджэту, якія кантралююцца падатковымі органамі, забясьпечана плацельшчыкамі Менску.

Працягвае большаць доля недзяржаўнага сэктару. За першае паўгодзьдзе ад гэтай катэгорыі плацельшчыкаў надышло 49,5% агульнага аб'ёму даходаў. Проці 2006 г. іх доля вырасла на 1,6%. Удзельная вага паступленьняў ад індывідуальных прадпрымальнікаў не зьмянілася і склала 2,4%.

Пятую частку паступленьняў забясьпечылі тры плацельшчыкі: «Белтрансгаз» (11,1% ад агульнай сумы), «Лукойл-Беларусь» (4,4%) і гарэлачны завод «Менск Крышталь» (2,7%).

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### Беларусь гатовая плаціць пеню

Увесь гэты тыдзень працягваліся перамовы між «Газпромам» і беларускім урадам, прадстаўленымі намесьнікам старшыні праўленьня «Газпрому» Валер'ем Голубевым і беларускім міністрам энэргетыкі Аляксандрам Азярцом. Беларускі бок прасіў у «Газпрому» адтэрміноўку выплатаў, нават цаною налічэньня пені на гэтую суму.

Запазычанасьць Беларусі за газ дасягнула $500 млн. Апошні тэрмін пагашэньня запазычанасьці быў прызначаны «Газпромам» на 23 ліпеня.

### «Гарызонт» пачне выпускаць фэны і прасы

Апрача тэлевізараў, сёньня завод выпускае яшчэ DVD-прайгравальнікі, аўдыётэхніку, радыёпрымачы, мікрахвалёўкі, пыласосы, тэхніку для кабэльнага ТВ, кандыцыянэры.

### Заробкі дасягнулі 710 тыс.

Паводле афіцыйных зьвестак, сярэдні заробак работнікаў у Беларусі «бруднымі» у чэрвені склаў 710 232 рублі (331 даляр у эквіваленце). У траўні сярэдні налічаны заробак складаў 686 852 рублі (або 320 даляраў).

**МБ**

# Гары Потэр у закладніках

Джаан К. Роўлінг — літаратурная тэрарыстка сусьветнага маштабу. Піша **Алесь Кудрыцкі.**

Чаго толькі ня робяць аўтары, каб заваяваць чытача. У XIX ст. Дастаеўскі засек у сваёй кнізе старую-працэнтшчыцу. У XX ст. Умбэрта Эка атруціў манаха. У XXI ст. Джаан К. Роўлінг узяла ў закладнікі хлопчыка, якога можа з поўным правам лічыць сваім сынам.

Нібы той бін Ладэн, аўтарка эпапэі пра Гары Потэра заявіла, што адзін (а можа, і не адзін) з галоўных герояў будзе ў фінале немінуча забіты. І чалавецтва выявілася бездапаможным перад тварам літаратурнага тэрарызму: яму засталося адно чакаць на гадзіну ікс, калі апоўначы адчыняцца кнігарні, разгорнуцца апошнія старонкі кнігі, і, угледаючыся ў твары забітых, можна будзе з жахам пазнаць бляск знакамітых круглых акуляраў. Ці па-здрадніцку ўздыхнуць з палёгкай, зразумеўшы, што памёр хтосьці іншы.

У сучасным сьвеце бэстсэлер перастае быць проста кнігай — ён ператвараецца ў маркетынгавую кампанію. Спачатку — піяр-раскрутка, інтэрвію аўтара, атмасфэра сакрэтнасьці ды абавязковыя інфармацыйныя ўцечкі пра сюжэт у інтэрнэце. Выхад кнігі — штурм кнігарняў у жывым тэлеэфіры, публічныя чытаньні апоўначы ды супэрмаркеты, напакаваныя суправаджальнымі прадуктамі накшталт постэраў, кубкаў ды гальштукаў з выявамі герояў. Пасьля — зьяўленьне шматлікіх дадатковых выданьняў на тэму кнігі (коміксы, размалёўкі, фотаальбомы ды сур'ёзныя крытычныя дасьледаваньні), стварэньне сайтаў, выхад кампутарнай гульні. Кульмінацыя кампаніі — прэм'ера чарговага блакбастэру. Калі ўсё прайшло ўдала, пішацца працяг кнігі — і кампанія паўтараецца наноў, штораз у большых маштабах.

Прыгоды Гары Потэра — месцамі зацягнутая, аднак безумоўна захапляльная ды таленавіта выпісаная кніга для дзяцей. Вось толькі незвычайная ўвага да яе, падаграваная выдаўцамі дзеля атрыманьня максымальнага прыбытку, змусіла і аўтарку і чытачоў весьці сябе даволі ненатуральна — нібыта яны ствараюць ды спажываюць не літаратурны, а інтэрактыўны мэдыйны прадукт.

Па-першае, пішучы свае кнігі, Роўлінг актыўна кантактавала з чытачамі ды, безумоўна, мусіла ўскосна ўлічваць іх жаданьні (мільённыя кантракты не прадугледжвалі чытацкага расчараваньня). Такім чынам, у нечым чытачы самі стварaлі гэтую кнігу.

Па-другое, узяўшы ў закладнікі Гары Потэра, Роўлінг зь пісьменьніцы ператварылася ў ньюзмэйкера. Бадай, упершыню рэальныя навіны ствараліся не самой кнігай, а непасрэдна яе прыдуманым пэрсанажам. Лёс няіснага Гары Потэра, якому пагражае віртуальная сьмерць, усхваляваў многіх ня менш за лёс жывых закладнікаў, захопленых якімі-небудзь талібамі.

Да чаго давялі нас мэдыі! Мы бачым у тэлевізары рэальную вайну, а ўспрымаем яе, нібы мастацкі фільм. Мы чуем пра тое, што пэрсанажам-прыдумкам пагражае віртуальная сьмерць, і шчыра зычым ім выжыць. Мы жывем у сьвеце

> Да чаго давялі нас мэдыі! Мы бачым у тэлевізары рэальную вайну, а ўспрымаем яе, нібы мастацкі фільм.

чараўнікоў, якія ствараюць рэальнасьць, варожачы над тэлепультамі ды кампутарамі.

Апошняя кніга Роўлінг зрабілася, бадай, найбольш чытанай — з апошняй старонкі — кнігай у сусьветнай гісторыі. Гары Потэр жывы — уффф... Пранесла. Іншымі героямі можна і ахвяраваць, абы ўсё было добра з тым, да каго пасьпеў так прызвычаіцца... Адчуваньне, падобнае да таго, калі ты глядзіш «Эўраньюз» і ў глыбіні душы цешысься, што бомбы ірвуцца не на тваёй вуліцы.

Гары Потэр быў абудзіў на Захадзе надзею на тое, што дзеці пачнуць болей чытаць. Цуду, аднак, не адбылося. Чыталі сапраўды больш — але, збольшага, тую самую Дж. К Роўлінг. Вырасла цэлае «пакаленьне адной кнігі». Сёньняшнія студэнты ўпершыню ўзялі ў рукі кнігу пра свайго аднагодка-ведзьмака, калі ім было па 10—11 год. Сёмы том — гэта канец іх дзяцінства. Цяпер яны — дарослыя, якія звыкліся да таго, што кнігу для чытаньня ім падказвае тэлевізар.

Хрысьціянскія цэрквы актыўна абвінавачваюць Роўлінг у тым, што праз яе кнігі ў душу дзяцей знаходзіць шлях д'ябал. Па-першае, Потэр зь сябрамі безь перапынку вядзьмачаць. Па-другое, у кнізе паўстае ўвасобленае сусьветнае Зло, аднак яму не супрацьстаіць увасобленае сусьветнае Дабро. Героі змагаюцца са злом без дапамогі звыш. То бок галоўная прэтэнзія ў тым, што Гары Потэр — кніга бяз Бога.

Але ці такі ўжо бязбожны Гары Потэр? Хлопца ахоўвае і дае яму сілу, найперш, бязьмежная любоў яго памерлых маці ды бацькі, потым — сяброўства, уласны досьвед ды кемлівасьць і толькі ў апошнюю чаргу — недасканалы інструмэнт чараўніцтва. Любоў — наймацнейшая сіла, якая перамагае зло — вось галоўная ідэя кнігі. Неяк не паварочваецца язык назваць яе антыхрысьціянскай. Зрэшты, апантаныя «потэраманы» выклікаюць такую самую ўсьмешку, як і зацятыя «потэрафобы» — бо і тыя і іншыя ставяцца да фантазіі нібы да рэальнасьці, бяздумна патрапляючы ў тую самую спакусьлівую мэдыяпастку.

Украінскі пераклад Гары Потэра многія лічаць нашмат больш удалым за расейскі. А вось кнігі пра Гары Потэра па-беларуску за гэтыя гады так і не зьявілася. Гэта тым больш дзіўна для краіны, якой ужо шмат год валадарыць злы чараўнік («самі-ведаеце-хто»), і дзе многія ўжо даўно чакаюць на зьяўленьне героя, што ведае чароўную формулу для абуджэньня народу да зьменаў. Вось толькі сапраўднае зло перамагаецца ўсётакі ня магіяй, а любоўю, сьмеласьцю ды гнуткім розумам — таксама, між іншым, мараль ад Дж. К. Роўлінг.





# Крызіс жанру перажыты

Сёлета на «Басовішчы» перамог расейскамоўны гурт.

Упершыню за 18-гадовую гісторыю фэст ва ўрочышчы Баро праходзіў у тры дні. Мажлівасьць выступіць атрымалі як мясцовыя панкі-пачаткоўцы, так і замежныя госьці. «А ў вас тут душэўна прымаюць», — кажа перад выхадам на сцэну лідэр літоўскага гурту «Mountainside». Госьць не расчараваўся пасьля выступу, хоць на пляцоўцы перад сцэнай таўкліся толькі некалькі чалавек. Жыцьцё на «Басовішчы» пачынае віраваць пад вечар, калі выступаюць хэдлайнэры. Аднолькава добра прымаюць фолк-мадэрн ад «Палацу», «казацкі рок» ад «Тінь Сонця», рэп ад «Чпб». Дэбютаваў на «Басовішчы» праект «Крамбамбуля». Дарэчы, арганізатары меркавалі запрасіць і «Ляпіс Трубяцкой», але ў тых быў канцэрт у Кіеве. Фэстываль перажыў «крызіс жанру»: калі некалькі год таму яго можна было сьмела назваць «фэстам цяжкага року», то сёлета музыка была напраўду на любы густ.

## Перамагла музыка

Разынка кожнага «Басовішча» — конкурс маладых камандаў. Вакол яго з кожным годам усё болей спрэчак. Скепсіс найперш выклікае ўзровень удзельнікаў у апошнія два гады. Гуртоў, блізкіх да ранейшых ляўрэатаў, — «маўзэраў», IQ48, Indiga — і блізка няма. Сёлетні конкурс можна назваць адным з самых слабых у гісторыі «Басовішча». Заяўкі на ўдзел пада-



«Басовішча» прачынаецца.

ла немалая колькасьць гуртоў — 53, аднак вартых перамогі было зусім няшмат. На агульным фоне адразу вылучылася наваполацкая каманда «Фляўс і Кляйн», якая пасьпела скарыць двойчы «Рок-Кола» і «Рок-каранацыю» у намінацыі «Лепшая рэгіянальная каманда». Адзіная бяда — гурт заўжды сьпяваў па-расейску, але пад «Басовішча» пераклаў некалькі тэкстаў. Вакаліст гурту Сяргей **(на фота справа)** шалёна скакаў па сцэне, высалапіўшы язык ды надрыўна сьпяваў: «На гарызонце ў празрыстым зонце тое неба». Словаў было практычна не разабраць, затое энэргетыка ішла ад «Фляўсаў» — ого-го! Журы пры вызначэньні пераможцы падзялілася: адны адстойвалі прынцып «беларускасьці», пад які «Фляўсы» не зусім падпадалі, другія на першае месца ставілі музычны чыньнік. Наваполацкі гурт усё ж перамог. Публіка ўспрыняла гэтую навіну неадназначна. Калі Сяргей з «Фляўса» пры ўручэньні прызу выбачаўся, што ня ведае беларускай і будзе казаць па-расейску, яго ледзь не асьвісталі. На другое месца журы паставіла экстрымалаў з гурту «SOK», а на 3-е — праект «Unia» з псэўдафолькавым адценьнем.

## «Басовішчу» трэба зорка

На гэтым «Басовішчы», як ніколі, абвастрылася праблема «беларускасьці» музыкі. Маладыя каманды збольшага пяюць па-расейску альбо па-ангельску, а на родную мову пераходзяць толькі для ўдзелу ў пэўнай складанцы альбо фэстывалі. Зь іншага боку: хто цяпер узгадае, што «Індыга» і «IQ48» колісь сьпявалі па-расейску? Тут не на мове трэба заганяцца. Выбірацца зь лякальнае пасткі, збудаваць большую сцэну, пашырыць інфраструктуру ды запрасіць зорку сусьветнага ўзроўню, — такія задачы мусяць стаяць перад арганізатарамі ў будучыні.

**Сяргей Будкін,**
**фота Андрэя Лянкевіча**



**Басовішча** (Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі)

культавы штогадовы фэст беларускай альтэрнатыўнай і рок–музыкі, які ад 1990 г. праводзіцца Беларускім аб’яднаньнем студэнтаў (БАС, адсюль і назва фэсту) пад Гарадком ва ўрочышчы Барок (Беласточчына). Адбываецца ў другой палове ліпеня. Традыцыйна на фэсьце ладзіцца конкурс маладых выканаўцаў. «Басовішча» дапамагло адкрыць такія гурты, як «Індыга», «IQ48», «Сьцяна», «БН», «Таварыш Маўзэр».



# Паралельным курсам

Чарговае выкрыцьцё «польскіх шпіёнаў» і кадравыя перастаноўкі ў КДБ: падзеі тыдня камэнтуе Віталь Тарас.

## Казка пра мальчышоў-плахішоў

Чарговае выкрыцьцё «польскіх шпіёнаў» у Беларусі і кадравыя перастаноўкі ў КДБ супалі ў часе з дыпляматычным скандалам паміж Лёнданам і Масквой праз «справу Літвіненкі». Гэтыя дзьве гісторыі, зразумела, не зьвязаныя паміж сабой. Яны адрозьніваюцца, найперш, паводле ступені міжнароднага розгаласу. Але акурат супастаўленьне маштабу і, галоўнае, магчымых наступстваў гэтых падзеяў дазваляюць, як падаецца, лепей зразумець некаторыя рэчы. Адчуць, так бы мовіць, розьніцу. Хаця размова ў абодвух выпадках ідзе пра спэцслужбы — КДБ і ФСБ.

Згаданыя падзеі ня ёсьць нейкімі выпадковымі спантаннымі эпізодамі — у абодвух выпадках іх трэба разглядаць як пасьлядоўнае разьвіцьцё пэўнай сытуацыі.

Напрыклад, арышты вайскоўцаў, абвінавачаных у спробе перадаць сакрэтную інфармацыю польскай выведцы, адбыліся задоўга да таго, як пра іх паведаміла АНТ. Але затое гэтая інфармацыя была агучаная намесьнікам старшыні КДБ Віктарам Вягерам роўна тады, калі ў Магілёве адбыўся напад на старшыню Дзяржкантролю Зянона Ломаця. Праўда, аб гэтым публіка даведалася постфактум, пасьля таго, як у незалежныя СМІ пратачылася інфармацыя, што на Ломаця напалі супрацоўнікі дзяржбясьпекі. Нават звычайны глядач, далёкі ад тэмы спэцслужбаў, мог задацца лягічным пытаньнем — а ці ня быў той тэлесюжэт манэўрам, які павінен быў адцягнуць увагу грамадзкасьці ад «праколу» КДБ у Магілёве? Адстаўка Сухарэнкі з пасады старшыні камітэту дзяржбясьпекі толькі ўзмацніла падазрэньні ў тым, што падобная пастаноўка пытаньня мае рацыю.

І хаця Лукашэнка, прадстаўляючы новага кіраўніка камітэту Жадобіна, пахваліў чэкістаў за апэрацыю па выкрыцьці шпіёнаў, нешта тут не стыкуецца. Незразумела, напрыклад, якія палітычныя дывідэнды магла прынесьці кіраўніцтву дзяржавы «спэцапэрацыя», якая закранае беларуска-польскія дачыненьні? Бо гэтыя дачыненьні без таго знаходзяцца, можна сказаць, на нулявым узроўні. Дастаткова сказаць, што новапрызначаны польскі пасол дагэтуль ня можа прыехаць у Менск.

Акрамя таго, зьвяртае на сябе ўвага кепская прапагандысцкая прапрацоўка шпіёнскай справы, якая яўна рыхтавалася пры дэфіцыце часу і фактаў. Цяжка паверыць, напрыклад, што польская альбо якая-небудзь яшчэ выведка ў сьвеце ўчэпіцца за афіцэра, які займаецца кантрабандай сьпіртовых напояў. Ды яшчэ, папаўшыся, імгненна пагаджаецца працаваць на варожую выведку. Уражаньне такое, што гэты пэрсанаж запазычаны з савецкага фільму для дзяцей «Мальчыш-Кібальчыш».

Ёсьць і яшчэ адна вэрсія — быццам кіраўніцтва РБ вырашыла прадэманстраваць важнасьць і карыснасьць для Масквы стратэгічнага партнэрства Менску ў рамках саюзнай дзяржавы.

Затрыманых афіцэраў (палова зь якіх — адстаўныя) абвінавацілі ня ў чым іншым, як у выведваньні зьвестак, зьвязаных з супрацьпаветранай абаронай. І гэтыя зьвесткі, нібыта, спатрэбіліся польскаму боку ў сувязі з маючым адбыцца разьмяшчэньнем амэрыканскай сыстэмы ПРА ў Польшчы. Такім чынам, застаецца прыпусьціць, што згаданая ПРА патрэбная Захаду не для таго, каб перахопліваць балістычныя ракеты, калі яны будуць запушчаныя з боку Ірану, а для таго, каб нанесьці ўдар па Беларусі і Расеі. Ну, і дзеля гэтага выведаць сакрэты іх проціракетнай абароны.

У такое могуць паверыць людзі, якія шчыра вераць ва ўсясьветную жыда-масонскую змову. Але ў такі сцэнар трэцяй усясьветнай вайны сёньня, хутчэй за ўсё, ня вераць ні ў Маскве, ні ў Менску. Інакш паводзіны, скіраваныя на абвастрэньне канфрантацыі з Захадам, выглядалі б абсалютна алягічнымі. Калі толькі кіраўніцтва Беларусі й Расеі ня мае схільнасьці да суіцыду.

Падобна да таго, што апошнія прапагандысцкія захады Крамля (а таксама й Менску) супраць Захаду прызначаныя выключна для ўнутранага карыстаньня. Але ў абодвух выпадках гэтыя высілкі далі збой.

## «Нашы» прызадумаліся...

Немагчыма не зьвярнуць увагу на тое, што хоць высылка брытанскіх дыпляматаў праз адмову выдаць Англіі Лугавога, падазраванага ў забойстве Літвіненкі, была скрытыкаваная расейскім МЗС, захады ў адказ былі даволі стрыманымі. Было вырашана выслаць чатырох ангельскіх дыпляматаў — акурат столькі, колькі было выслана з Англіі; уводзяцца візавыя абмежаваньні на ўезд брытанскіх урадавых чыноўнікаў — такія самыя абмежаваньні былі перад тым уведзеныя ў адносінах да расейскіх чыноўнікаў; Расея адмовілася ад супрацы зь Вялікай Брытаніяй у пытаньнях барацьбы з тэрарызмам — аб тым самым заявіў перад гэтым брытанскі ўрад. Але вось што цікава — ніякага прапагандысцкага шквалу, забароны на ўвоз ангельскага чаю (адрозна, скажам, ад польскага мяса ці грузінскага віна) з боку

афіцыйнай Масквы і расейскіх СМІ не назіраецца. «Нашы», якія раней праходу не давалі брытанскаму паслу ў Маскве, якія бралі ў аблогу латвійскае ды эстонскае пасольствы, спакойна адпачываюць сабе на возеры Селігер у самы разгар скандалу.

Але нічога загадкавага тут няма. Усе цудоўна разумеюць, што занадта моцна расейская ўладная і прыўладная прадпрымальніцкая эліта завязаныя зь бізнэсам у Англіі. Ня толькі Абрамовіч, многія расейскія прадпрымальнікі і чыноўнікі купляюць у Лёндане маёмасьць, трымаюць рахункі ў банках, пасылаюць вучыцца дзяцей ды й проста любяць адпачываць і жыць на шырокую нагу? Туды, у выпадку сур’ёзнай небясьпекі на радзіме можна выехаць у кожны момант на жыхарства, папрасіць палітычнага прытулку, як гэта зрабіў Беразоўскі. Вось чаму захады афіцыйнага Лёндану ў сувязі са «справай Лугавога» былі так балюча і нэрвова ўспрынятыя ў Маскве. Занадта шмат людзей, відаць, не хацелі б сапраўднага пагаршэньня стасункаў з Англіяй, асабліва ў галіне эканомікі і бізнэсу. Сутыкнуўшыся з сытуацыяй, у якую патрапілі ўлады Беларусі, многім прадстаўнікам якіх шлях у Эўрасаюз і ЗША зачынены, расейскія чыноўнікі крыху зьбьянтэжыліся. Ім вельмі не хацелася б трапіць у лік краінаў-ізгояў разам з Паўночнай Карэяй, Іранам і… Беларусьсю. Ім усё-такі хочацца адчуваць сябе эўрапэйцамі (хоць і жыць пры гэтым па ўласных правілах і законах).

Таму і апошні шпіёнскі скандал у саюзнай Беларусі быў успрыняты ў Маскве, мякка кажучы, без энтузіязму. Аб гэтым сьведчыць інтанацыя, зь якой расейскія інфармацыйныя каналы перадавалі рэпартажы аб выкрыцьці «польскай рэзыдэнтуры». Гэта была інтанацыя, так бы мовіць, крывой усьмешкі. Ва ўсіх сюжэтах на шпіёнскую тэму на расейскім тэлебачаньні прысутнічала сакрамэнтальная фраза: «…Як паведамляе беларускае тэлебачаньне». Далей, відаць, трэба было чытаць так: «Ну, вы ж разумееце — ня ўсё трэба браць на веру».

## Розьніца ў часе

На фоне сапраўды грандыёзнага скандалу, выкліканага беспрэцэдэнтнай справай аб забойстве грамадзяніна Вялікай Брытаніі «агульнанебясьпечным спосабам» — то бок, з дапамогай радыеактыўнага рэчыва, дзеяньне якога лёгка можна параўнаць з так званай «бруднай атамнай бомбай», справа «польскіх шпіёнаў» у Беларусі выглядае дробязьзю. Ды яшчэ й не патрэбнай нікому дробязьзю. У першую чаргу, не патрэбная яна цяпер Крамлю, заклапочанага пэрспэктывай рэальнага (а ня толькі віртуальнага) процістаяньня зь Вялікай Брытаніяй і ўсёй Эўропай, а таксама з ЗША. А ня тым, што робіць «галоўны хаўрусьнік» у Беларусі, які не аднойчы паказаў сябе хаўрусьнікам ненадзейным і нават у многіх выпадках шкодным.

Іншая рэч, што ў справе Літвіненкі ў Расеі выйсьця няма. Цугцванг. Ня можа Масква выдаць Лугавога — і ня толькі таму, што гэтага не дазваляе Канстытуцыя. (Туркмэністану ж і Ўзбэкістану выдавалі зьбеглых апазыцыянэраў — і нічога, ніхто не абураўся.) Выдаць Лугавога — значыць, прызнаць сваю паразу.

Ясна, што ў гэтым сэнсе паводзіны кіраўніцтва Беларусі і кіраўніцтва спэцслужбаў, у прыватнасьці, нічым не адрозьніваюцца ад паводзінаў расейскіх калегаў. Можна прыводзіць колькі заўгодна вэрсіяў наконт апошніх кадравых прызначэньняў (нехта кажа, што гэта ўмацаваньне ўплыву Віктара Лукашэнкі, нехта пра тое, што кіраўнік дзяржавы сам дбае пра ўмацаваньне асабістай бясьпекі, не давяраючы нікому і г.д.), але аб сапраўдных прычынах ці хоць бы матывах прынятых рашэньняў мы не даведаемся. І незалежным мэдыям у Беларусі застаецца толькі здагадвацца аб іх сапраўдных прычынах і акалічнасьцях на падставе рознага роду больш ці менш годных веры крыніцаў альбо проста высмоктваць інфармацыю з пальца.

Думаецца, што найбольшае раздражненьне Крамля выклікае тое, што справа пра забойства Літвіненкі ад волі спэцслужбаў, ад волі вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы ўжо не залежыць. Ні замаўчаць, ні сьпісаць яго ў архіў ужо ня ўдасца. Занадта моцны рэзананс у брытанскіх ды й ня толькі брытанскіх СМІ гэтая справа выклікала. Вяршыняй абсурду ўяўляецца тлумачэньне расейскіх «палітолягаў» наконт прычынаў скандалу: быццам новы прэм’ер-міністар Вялікай Брытаніі Гордан Браўн і Лейбарысцкая партыя зацікаўленыя ў ім, паколькі разьлічваюць зарабіць на скандале нейкія прапагандысцкія пункты. Пры такой пільнай увазе СМІ брытанскаму ўраду, хто б ні апынуўся ў выніку выбараў на чале кабінэту, давядзецца ісьці ў гэтай справе да канца, да ўсталяваньня ісьціны ў поўным аб’ёме. І калі выявіцца, што Браўн і міністры нешта недагаворваюць ці спрабуюць маніпуляваць грамадзкай думкай, мэдыі злупяць зь іх тры скуры. У Англіі і за куды менш сур’ёзныя правіннасьці міністры разьвітваліся з кар’ерай.

Варта нагадаць, што сталася з правым урадам у Гішпаніі, калі прэм’ер паспрабаваў прыпісаць выбухі на чыгуначным вакзале тэрарыстам ЭТА. (Насамрэч, гэта была справа рук Аль-Кайды). Спроба ўраду падмануць грамадзтва і паказаць на больш зручнага для палітычнай сытуацыі ворага абярнулася для пануючай партыі катастрофай на выбарах.

Рана ці позна, з дапамогай Скотлэнд-Ярда і брытанскай прэсы мы даведаемся, хто быў калі не замоўцам, дык выканаўцам забойства былога афіцэра ФСБ Літвіненкі і адкуль у злачынцаў узяўся радыеактыўны палёній. У гэтым няма ніякага сумневу.

Рана ці позна мы даведаемся і пра тых, хто стаіць за зьнікненьнямі Захаранкі, Ганчара, Красоўскага, Завадзкага. Розьніца са справай Літвіненкі палягае толькі ў часе, які на гэта можа спатрэбіцца.

# Дзень народзінаў Дашкевіча

У мінулы чацьвер зь Менску стартаваў аўтапрабег, прысьвечаны дню нараджэньня Зьмітра Дашкевіча. Яму 20 ліпеня споўнілася 26 гадоў. Цяпер Зьміцер адбывае паўтарагадовае зьняволеньне ў шклоўскай калёніі за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт».

У аўтапрабег па маршруце Баранавічы — Нясьвіж — Салігорск — Магілёў — Шклоў са станцыі Дружная накіраваліся чатыры машыны. У дарогу выправіліся былы палітвязень Павал Севярынец, намесьнік старшыні Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, «маладафронтаўцы» Барыс Гарэцкі і Зьміцер Хведарук, некалькі журналістаў.

Машыны пасьпелі праехаць 20 км па Берасьцейскай шашы, іх спыніў першы ж пост ДАІ. Міліцыянты папрасілі кіроўцаў паехаць у Дзяржынскі райаддзел міліцыі для праверкі дакумэнтаў. Там сказалі, што машыны застаюцца ў іх да поўнай праверкі, а пасажыраў адпусьцілі. Машыны ўладальнікам аддалі толькі назаўтра.

Частка ўдзельнікаў прабегу вярнулася ў Менск, а частка ўсё ж накіравалася ў Баранавічы на электрычках. Там яны ўбачыліся зь Яраславам Грышчэнем.

Апоўначы ўдзельнікі прабегу ўжо былі ў Салігорску. Сустрэліся з Іванам Шылам і яшчэ да сьвітанку цягнікамі накіраваліся ў Магілёў.

Сустрэцца з палітвязьнем Артурам Фінькевічам не атрымалася, хлопца цэлы дзень трымалі ў камэндатуры.

У другой палове дня ў пятніцу дванаццаць удзельнікаў аўтапрабегу дабраліся да Шклова. Недалёка ад калёніі хлопцаў і дзяўчат затрымалі некалькі дзясяткаў міліцыянтаў і накіравалі ў Шклоўскі РУУС для высьвятленьня асобы. Начальнік райаддзелу Юры Манькоў паведаміў, што калёнія — рэжымны аб’ект і быць ля яе не рэкамэндуецца.

Супрацоўнікі МУС пасадзілі моладзь на цягнік да Магілёва. Пільнасьць з боку праваахоўнікаў удзельнікі акцыі адчувалі аж да Менску.

**Зьміцер Панкавец**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



**На дзень народзінаў палітвязьня Зьмітра Дашкевіча маладафронтаўцы вывесілі ў Менску расьцяжку зь віншаваньнямі. Супрацоўнік міліцыі зьявіўся раней, чым яны пасьпелі яе замацаваць.**

## 10 ліпеня

### За бардаўскі фэстываль — штраф

Арганізатараў канцэрту бардаўскай музыкі ў Гомелі 23 чэрвеня **Ларысу Шчыракову і Зьмітра Жалезьнічэнку** выклікалі ў абласную інспэкцыю Міністэрства па падатках і зборах. Па вэрсіі падаткавікоў, нехта з гледачоў канцэрту нібыта бачыў на месцы скрынку, у якую паклаў пяць тысячаў рублёў, а вось чэк гэтаму чалавеку ня выдалі. Шчыракову і Жалезьнічэнку абвінавачваюць у незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці. Матэрыялы перададзеныя ў суд. Арганізатарам імпрэзы пагражае штраф да 50 базавых велічынь.

### Флэш-моб у абарону Горадні

Акцыя адбылася на пешаходнай вуліцы Савецкай. Чацьвёра маладзёнаў трымалі аркушы паперы са словамі «Вярніце нашу гісторыю». Двое ўдзельнікаў акцыі капалі пясок дзіцячымі шуфлікамі, яны мелі прымацаваныя да галавы партрэты старшыні гарвыканкаму **Аляксандра Антоненкі** і кіраўніка аблвыканкаму **Ўладзімера Саўчанкі**.

### Судзяць Лукашова

10 ліпеня падчас судовага разгляду пацярпелы па справе **Кастуся Лукашова**, супрацоўнік міліцыі **Анатоль Сушчэня**, адмовіўся ад сваіх матэрыяльных прэтэнзій да абвінавачанага. Пракурор прасіў суд пакінуць у сіле папярэдняе рашэньне суду — два гады ўмоўна, пры гэтым лічачы, што няма ніякіх падстаў не давяраць пацярпеламу А.Сушчэню.

### «Маладому фронту» адмовілі ў рэгістрацыі

Упраўленьне юстыцыі Менгарвыканкаму чарговы раз адмовіла ў рэгістрацыі менскай гарадзкой грамадзкай арганізацыі «Малады фронт». Гэта ўжо пятая такая адмова «МФ».

### Не даюць пікетаваць за Казуліна

Берасьцейскі гарвыканкам не задаволіў заяўку абласной арганізацыі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі на правядзеньне пікету ў падтрымку **Аляксандра Казуліна**.

## 11 ліпеня

### Каліноўцаў цягаюць у КДБ

Моладзевы актывіст **Аляксандар Рэзьнікаў**, які вучыцца ў Кракаве па праграме Каліноўскага, быў выкліканы ў Савецкі райаддзел КДБ Менску. Прадстаўнікоў спэцслужбаў цікавілі падрабязнасьці вучобы.

### На Фінькевіча ціснуць

Начальнік Магілёўскай спэцкамэндатуры падпалкоўнік **Аляксандар Ламаза** нагадаў **Артуру Фінькевічу** пра тое, што на яго, як злоснага парушальніка рэжыму, могуць завесьці крымінальную справу і зьмяніць месца адбываньня пакараньня.

### Грышчэня хадзіў на экспэртызу

Баранавіцкі актывіст «Маладога фронту», **Яраслаў Грышчэня** праходзіў псыханэўралягічную экспэртызу ў мясцовым дыспансэры. Яраслава прывялі ў асобны пакой, дзе знаходзіліся два псыхіятары (так яны адрэкамэндаваліся), а таксама сьледчая **Юлія Аскальдовіч**, адваката не пусьцілі. Хлопца пасадзілі на крэсла пасярод кабінэту і пачалі задаваць пытаньні, што тычаць ягонай біяграфіі, бацькоў, апазыцыйнай дзейнасьці. Пыталіся, ці ня лічыць ён сваю дзейнасьць бессэнсоўнай, чаго дабіўся ў жыцьці, кім ён ёсьць цяпер.

## 12 ліпеня

### Ад палякаў адчапіліся

Беларускія ўлады спынілі крымінальную справу супраць чатырох чальцоў Саюзу палякаў Беларусі. Анджэй Пачобут, Юзаф Пажэцкі, Веслаў Кеўляк і Анджэй Пісальнік змогуць цяпер зьвярнуцца ў гарадзенскую міліцыю па штамп у пашпарце, які дазваляе выяжджаць зь Беларусі ва ўсе краіны сьвету.

### Ліквідоўваюць «Супольнасьць»

Пэрспэктыва закрыцьця навісла над чарговай пакуль яшчэ зарэгістраванай дэмакратычнай грамадзкай арганізацыяй — Менскім гарадзкім грамадзкім аб'яднаньнем «Цэнтар Супольнасьць».

## 13 ліпеня

### Казулін сустрэўся зь сям'ёй

Адбылося трохдзённае спатканьне **Аляксандра Казуліна**, які адбывае турэмнае зьняволеньне, з сям'ёй. На спатканьне ў віцебскую калёнію паехалі яго дочкі Вольга і Юлія. Дзяўчаты прабудуць з бацькам да панядзелку. Дарэчы, акурат у гэты дзень споўніўся год, як быў вынесены прысуд Аляксандру Казуліну. У заяве прэзыдыюму БСДП гаворыцца, што гэты працэс быў беспрэцэдэнтным: упершыню ў краіне асудзілі былога кандыдата на пасаду прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

### Сьмеласьць Валожын узяла

Вернікі пратэстанцкай суполкі «Царква Ісуса Хрыста» адстаялі свой летнік у Валожынскім раёне, дзе адпачывае каля сотні чалавек. Мясцовыя ўлады патрабавалі закрыць летнік, калі ня будуць выкананыя ўсе неабходныя працэдуры. Патрабавалі падаць сьпіс усіх удзельнікаў арганізаванага адпачынку, здабыць дазвол абласной адміністрацыі і камітэту ў справе рэлігіяў на правядзеньне летніка.

## 16 ліпеня

### Дзень салідарнасьці

Дзясяткі людзей прыйшлі да касьцёлу Сьвятога Язэпа на вуліцы Кірылы і Мяфода. Людзі трымалі у руках партрэты палітвязьняў і маліліся. Побач дзяжурылі супрацоўнікі АМАПу. Раней некалькі дзясяткаў чалавек выйшлі на Кастрычніцкую плошчу Менску з партрэтамі палітвязьняў. Людзі здолелі прастаяць на плошчы ўсяго некалькі хвілін. Як толькі ўдзельнікі акцыі дасталі партрэты палітвязьняў, да іх падышлі супрацоўнікі АМАПу ў цывільным і запатрабавалі разысьціся. Людзей выціснулі з плошчы на праспэкт Незалежнасьці ў бок ГУМу.

### Не пусьцілі журналіста

Беларускія памежнікі не дазволілі праехаць з Варшавы ў Маскву карэспандэнту «Gazety Wyborczej» **Вацлаву Радзівіновічу**.

### Мілінкевіч зьвярнуўся ў КДБ

Лідэр руху «За свабоду» **Аляксандар Мілінкевіч** накіраваў зварот кіраўніцтва КДБ з патрабаваньнем спыніць перасьлед за іншадумства студэнтаў, якія навучаюцца за мяжой па праграмах для рэпрэсаванай моладзі. У гэты самы дзень Мілінкевіча затрымлівалі ў Астраўцы за знаходжаньне ў памежнай зоне.

### Сьцягі над Віцебскам

У ноч з 13 на 14 ліпеня легендарны Мірон вывесіў над фэстывальным Віцебскам два бел-чырвона-белыя сьцягі: над абласным судом і каварняй «Аўрора».

## 19 ліпеня

### Забаранілі пікеты на Бангалоры

Менгарвыканкам адмовіў у правядзеньні ў парку «Дружбы народаў» пікетаў салідарнасьці з палітвязьнем **Аляксандрам Казуліным**. Плянавалася, што пікеты пройдуць з 21 да 31 ліпеня.

### За майку

Актывіст Руху «За Свабоду» **Яраслаў Берніковіч** з Глыбокага (Віцебская вобласьць) аштрафаваны на 10 базавых велічыняў за тое, што быў апрануты ў майку з надпісам «Рух «За Свабоду».

### Закрываюць «зялёных»

Міністэрства юстыцыі накіравала ў Вярхоўны Суд іскавую заяву аб ліквідацыі Беларускай экалягічнай партыі зялёных «БЭЗ». Як паведамляе прэс-служба Мін'юсту, падставай для гэтага паслужыла невыкананьне партыяй нормаў беларускага заканадаўства.

### На волі Каліта

Старшыня моладзевай камісіі партыі БНФ **Алесь Каліта** адседзеў 15 сутак арышту ў турме на вуліцы Акрэсьціна паводле абвінавачаньня ў дробным хуліганстве.

## 23 ліпеня

### На 10 сутак

Маладафронтаўцы **Кірыла Мацкевіч** і **Уладзімер Сяргееў** асуджаныя на 10 сутак арышту. 20 ліпеня, у дзень народзінаў зьняволенага лідэра моладзевага руху Зьмітра Дашкевіча ў Менску, на мосьце цераз Нямігу, яны паспрабавалі вывесіць віншавальную расьцяжку «З днём народзінаў, Зьміцер Дашкевіч!»

### Зь міліцыі ў больніцу

20 ліпеня ў Менску каля плошчы Якуба Коласа за нашэньне майкі «За Свабоду» быў затрыманы **Максім Сергіец**. Ужываньне фізычнай сілы з боку міліцыянта справакавала ў затрыманага прыступ хваробы. Лекары рэкамэндавалі шпіталізацыю.

### Ператрус у Гарэцкага

Адбыўся ператрус на кватэры моладзевага актывіста **Барыса Гарэцкага**. Ператрус праводзілі супрацоўнікі абласнога КДБ. У выніку канфіскаваныя кампутарны сыстэмны блёк і падшыўка «Нашай Нівы».

## 24 ліпеня 2007

### Севярынец на сутках

Суд Фрунзэнскага раёну Менску асудзіў **Паўла Севярынца** і **Аляксея Шэіна** на 15 сутак зьняволеньня за распаўсюд улётак з заклікам прыняць удзел у мерапрыемствах апазыцыі, прымеркаваных да Дня незалежнасьці 27 ліпеня.

### Мілінкевічу адмовілі ў рэгістрацыі руху

Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі рэспубліканскага праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Рух «За Свабоду». Заснавальнікі аб'яднаньня маюць намер цягам месяца абскардзіць рашэньне Мін'юсту ў Вярхоўным судзе РБ, падрыхтаваць новы ўстаноўчы сход, а таксама патрабаваць сустрэчы зь міністрам юстыцыі В.Галаванавым і адмены рашэньня Мін'юсту.

**ЗП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ НА ПЛЯЖЫ.** У Горадні завершыўся скульптурны пленэр «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» з сэрыі «Легенда зь пяску». Паколькі гарадзенскія ўлады не далі дазволу на мерапрыемства, кіраўнік праекту Генадзь Лойка вырашыў прызямліць свайго Хрыста... на гарадзкім пляжы. Каля дваццаці актывістаў працавалі з вадой і пяском амаль двое сутак. Памер скульптуры ў сем разоў большы за чалавечы рост.

# Вялікі дзякуй

**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Ніне Б.** з Астравецкага раёну.
**Я.Ш.** з Маладэчна.
**Рэгіне Д.** з Барысаўскага раёну.
**Карыне Ш.** зь Віцебску.
**Ф.К., А.Б.** з Полацку.
**Алене З., Генадзю Л.** з Гомелю.
**І.Г.** са Смалявіцкага раёну.
**Міхаілу А.** зь Нясьвіскага раёну.
**Фёдару К.** з Талачынскага раёну.
**Алесю М.** з Наваполацку.
**Е.Б.** з Глыбоцкага раёну.
**Анатолю К.** са Стаўпецкага раёну.
**А.А., Лідзіі А., Вячаславу С., Аляксею Ж.** з Баранавіч.
**Васілю Л.** з Аршанскага раёну.
**А.Д., Пятру П., Галіне Л.** з Горадні.
**Сяргею І.** з Салігорску.
**Андрэю А.** зь Менскага раёну.
**Алесю С.** з Кіраўскага раёну.
**Міхасю Т.** са Слуцку.
**Юр'ю К., Сяргею А.** зь Берасьця.
**І.В., Паўлу П., Людміле І., Вадзіму Г., І.Л., В.К., Марыі Ж., Міхаілу Ж., А.Т., Тацяне Н., Тамары Ц., Маргарыце Х., А.З., Т.Ш., Вользе Л., Ірыне Б., Георгію Г., С.Н., Жаньне К., Ю.Ю., А.К., Анатолю М., Любові С., Сяргею Ц., А.П., Анатолю К., В.К., Людміле Л., Валеру С., Уладзімеру Х., Сяргею А., Аляксею Ш.** зь Менску.

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся да Рамана: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перaказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Прыйшлі падкупляць

**На Горацкі ільнозавод прыходзілі БРСМаўцы агітаваць моладзь, тых, каму яшчэ няма 32 гадоў, удзельнічаць у справах гэтае ўстановы.**

Казалі, што дадуць ільготы ў цырульнях, падпішуць нейкі карпаратыўны плян з МТС на 150 хвілінаў дармовых размоў і г.д. Карацей — падкуплівалі людзей...

Каб жа хутчэй мінуліся гэтыя часіны!

**Паўлюк Сяды, Горкі**

## З войска

**Час ідзе… Час, увогуле, — незвычайная зьява ў вечнасьці.** Сапраўды, ён падобны да нейкай незвычайнай матэрыі. Тут, у войску, у лесе, ён цягнецца, як сьлімак у сусьветным падарожжы. Калі глядзіш у будучыню, здаецца, твой дзень вызваленьня яшчэ далёка-далёка (у гэты момант разумееш, што такое вечнасьць), а калі глядзіш назад, то здаецца, што прамінуў хутка, нават хутчэй, чым у кожнага з вас, бо разумееш, што ты асабліва нічога не зрабіў за гэты год. Малюнкі ўспамінаў пераносяць цябе з карантыну і двухтыднёвай вучэбкі адразу ў гэты лес; тыя самыя штодзённыя пэйзажы (у залежнасьці ад сэзону мяняюцца толькі колеры: зь цёмна-шэрага да жоўтага ці зялёнага); тыя ж будынкі; тыя надзвычайныя выпадкі, якія лёс прыносіць усяго толькі два на месяц, а астатні час — на роздумы, роздумы…

**Юрка Бакур, Горадня**

## Зрабілі б лепш падземны пераход

**Пішу ў працяг тэксту Пінчука ад 6 ліпеня.** Так, адбываецца татальнае руйнаваньне каштоўных мясьцін у вялікіх і малых гарадох Беларусі — у Менску, Горадні, Магілёве, цяпер, вось, і ў Пінску. Гомель таксама не застаецца ўбаку.

Адметнасьцю Гомелю заўсёды былі дрэвы. І наймацнейшы ўдар наносіцца па іх. Узяць, дзеля прыкладу, парк Фэстывальны. Гэта невялікі лапік цудам ацалелай жывой зямлі, заціснуты будынінамі. Гадоў сем таму выдзерлі дрэвы на тэрыторыі, адпаведнай па плошчы футбольнаму полю, ды паставілі невялічкую цэркаўку. Праходзіць яшчэ колькі гадоў. Невялічкую сажалку абкружваюць дарожкай з бэтонных плітак, а непадалёк ладзяць бээрэсэмаўскую дыскатэку.

Сёлета замест сажалкі ўтвораная ў зямлі вялізная круглая дзірка, вакол якой працуе тэхніка, каб зрабіць яе яшчэ глыбейшай ды шырэйшай. Побач шыльда, у якой месьцічаў перапрашаюць за часовыя нязручнасьці «ў сувязі з рэканструкцыяй сквэру».

Калі ўжо брацца земляныя работы, то ў Гомелі шмат чаго можна зрабіць карыснага. Падземных пераходаў пад вуліцамі ў горадзе, які некалі быў паўмільённым, усяго два!

І яшчэ адну карысную справу можна было б зрабіць. Гомель на час пракладаньня чыгункі амаль увесь месьціўся між чыгункай і ракой. Адпаведна і вакзал быў арыентаваны ў бок ракі. Цяпер з тыльнага боку вакзалу пражывае большая частка насельніцтва, разьмешчаная бальшасьць прадпрыемстваў. А едуць да вакзалу ў аб'езд, бо няма зручнага скразнога тунэлю пад чыгункай. Цэнтар гораду загрувашчваецца, і толькі цуд ды майстэрства работнікаў ДАІ не дазваляюць стварыцца аднаму суцэльнаму корку.

Скразны тунэль перашкаджае зрабіць вагонарамонтны завод. Трэба было б выняць ня так і шмат грунту ў параўнаньні з тым, што было вынята ў сквэрыку. Аднак жа камунікацыі, узгадненьні.

Вось тут мы і падыходзім да адказу на пытаньне — якім тэрыторыям ці аб'ектам пагражае «рэканструкцыя». Гэта могуць быць каштоўныя будынкі, прыродныя аб'екты, уключаныя ў гарадзкое асяродзьдзе — паркі, пусткі і г.д., а таксама і плошчы, ходнікі, проста вялікія пляцоўкі перад асобнымі пабудовамі. Для выканаўцы работ важна, каб аб'ект быў як мага менш нашпігаваны камунікацыямі (менш узгадненьняў зь іншымі арганізацыямі), меў вялікія памеры (ад гэтага залежыць узровень фінансаваньня) і да яго быў зручны транспартны доступ (самому будаўнічаму начальству даводзіцца туды езьдзіць).

На здымку ўнізе: гэта не здабыча карысных выкапняў адкрытым спосабам, а рэканструкцыя сквэрыку.

**J.-D. Masson, Гомель**

## «Зьбяромся ў вялікі гамуз»

**Перш-наперш віншую Вас са 100-годзьдзем газэты і жадаю Вам усяго самага найлепшага і мужнасьці ў Вашай нялёгкай справе!**

Так склалася, што ў сярэдзіне 90-х, на ўзьлёце беларушчыны ў нашай краіне, я, настаўнік (сёньня — пэнсіянер зь дзесяцігадовым стажам) напісаў гэтыя шчасьлівыя радкі пра нашу мову.

Сам я напалову расіянін (па бацьку), напалову польскі беларус (па маці), але ніколі ня ставіў пад сумнеў павагу да беларускай мовы. Як і ўсе мае аднагодкі, я выхаваны на расійскай культурнай спадчыне, без сумневу — вялікай — усе мы жылі ў Савецкім Саюзе...

Абставіны нашага сёньняшняга жыцьця змушаюць нас жыць у дзьвюхмоўі. Пры любой магчымасьці карыстаюся беларускай мовай, якую лічу роднай.

Не цурайцеся Роднае Мовы
Добра ведаць замежныя словы
Ды гаворкі суседзяў-сяброў...
Не цурайцеся Роднае мовы,
Што спрадвеку прыйшла ад дуброў.
Ад азёр, што так шчыра глядзяцца,
Ад нябёс пазычаўшы блакіт...
Няўжо Вам палеткі ня сьняцца
Ды лугоў веснавы аксаміт?!
Не цурайцеся Роднае мовы,
Бо зьнямее навек Беларус,
Страціць гонар свой сьціплы-вясковы...
Не! Зьбяромся ў вялікі гамуз —
Хай сьпяе беларускае слова!
Не цурайцеся роднае мовы!

**К.Пятроў, Баранавічы**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**



Гіры—Рымдзюны—Гервяты. Рэпартаж зь літоўскіх вёсак Астравеччыны. Піша **Зьміцер Панкавец**.

# Гергуны і гуды




Найбольшы цэнтар літоўскасьці ў Беларусі знаходзіцца ў Астравецкім раёне. У склад Гервяцкага сельсавету ўваходзіць каля дзесяці вёсак, у якіх размаўляюць па-літоўску. Найбольшыя зь якіх — Гервяты, Рымдзюны і Гіры.

Як ні дзіўна, але «літоўскія астраўкі» захаваліся дзе-нідзе на тэрыторыі вялікага «беларускага мора». Яны захавалі сваю балцкую мову, культуру, традыцыі.

## Гіры

«Лаба», — вітаюцца з намі вяскоўцы ў Гірах.

Гаворку зразумець неспрактыкаванаму ў літоўскай мове чалавеку немагчыма. З размоваў тутэйшых беларускае вуха можа разабраць хіба толькі расейскі мат, якім мясцовыя жыхары шчодра перасыпаюць сваю мову.

На могілках у Гірах ёсьць старая драўляная капліца. На сьвяты сюды прыяжджае ксёндз з Гервятаў. Службы, натуральна, па-літоўску. Як ні стараюся, але не магу знайсьці на надмагільных плітах ніводнага славянскага прозьвішча, як няма і ніводнага надпісу кірыліцай.

Заўважаю, што ля адной з магіл завіхаецца мужчына гадоў пяцідзесяці. Падыходжу, каб пачаць размову. Майго суразмоўцу завуць Ёзас Петрыкас (у савецкім пашпарце яго імя пісалі як Іосіф Петрык), ён мясцовы, але ўжо каля 30 гадоў жыве ў Вільні, працуе зваршчыкам.

Ёзас кажа, што абсалютна ўсе ягоныя аднаклясьнікі цяпер жывуць у Літве. Тое і ня дзіва, два разы на дзень праз Гіры праходзіць аўтобусны маршрут зь Вільні. Квіток каштуе ўсяго 9500 рублёў. Рэйс у вёскі суайчыньнікаў даціруецца ўрадам са спэцыяльнага фонду.

> З размоваў тутэйшых беларускае вуха можа разабраць хіба толькі расейскі мат, якім мясцовыя шчодра перасыпаюць сваю мову.

Петрыкас езьдзіць да старэнькай маці ледзьве не штотыдзень. З Астраўца ніводнага маршруту да Гіраў ня ходзіць, што тады казаць пра Менск. «Зусім вы, беларусы, пра нас не клапоціцеся», — не без дакору ў голасе гаворыць Ёзас.

Адчуваецца, што мой суразмоўца ўвесь час адасабляў «нас» (літоўцаў) ад «вас» (беларусаў). Ці ня гэта акалічнасьць і дазволіла літоўскім населеным пунктам ня зьнікнуць між шматлікімі беларускімі вёскамі.

Петрыкас з намі размаўляе на добрай расейскай мове, дома — толькі па-літоўску. Ягоная жонка таксама зь мясцовых літоўцаў.

Ён хваліць Лукашэнку за тое, што навёў у краіне парадак, і ня можа ўзгадаць прозьвішча літоўскага прэзыдэнта. Аднак вяртацца ў Беларусь ён не зьбіраецца, бо ў «Літве большыя пэрспэктывы».

«Якая розьніца, ці ты беларус, ці літовец? — кажа Петрыкас. — Помню, што маладымі, калі прыходзілі на танцы, то часта біліся гергуны з гудамі, але так жа паўсюль, а ня толькі ў нас».

Як ні крыўдна, але гэты літоўскі астравок у Гірах хутка зьнікне з мапы Беларусі. Зьнікне не праз асыміляцыю, яна Гірам ужо не пагражае, папросту вёска катастрафічна старэе. Ужо цяпер тут засталося ўсяго некалькі дзясяткаў чалавек, праз колькі дзесяцігодзьдзяў тут банальна можа нікога не застацца.

Такі ж лёс, толькі, відаць, яшчэ хутчэй за Гіры, паўторыць і меншыя літоўскія вёскі, кшталту Гелюноў і Гудзенікаў.

## Рымдзюны

З гэтага гледзішча колькасьці насельніцтва Рымдзюны падаюцца куды больш пэрспэктыўнай вёскай. Тут ёсьць крама, пошта, фэрма. Таксама — ся-

Працяг на старонцы 20.

# Гергуны і гуды



**Касьцёл у Гервятах — адзін з найвышэйшых у Беларусі.**

**Працяг са старонкі 19.**

рэдняя школа. Яна, дарэчы, літоўская, такіх толькі дзьве ў краіне, другая знаходзіцца ў Пелясе (Воранаўскі раён). Статус літоўскага мае і рымдзюнскі дзіцячы садок.

У Рымдзюнах вельмі акуратныя хаты. Адметныя — практычна ўсе з вэрандамі. У дварах нярэдка можна ўбачыць драўляныя скульптуры мядзьведзяў, якія ў сваіх кіпцюрастых лапах надзейна трымаюць бочачкі зь мёдам. Традыцыя?

Практычна ля кожнай хаты стаяць машыны зь літоўскімі нумарамі. На выходныя папрыязджалі дзеці...

У 2001 годзе ў Рымдзюнах быў адкрыты Літоўскі культурна-адукацыйны цэнтар. У будаўніцтве і школы, і цэнтру фінансава дапамагала Літоўская Рэспубліка. Найбольшую дапамогу аказваў першы пасол Літвы ў Беларусі Аўгуліс Альфонсас, які таксама паходзіць з гэтых мясьцінаў.

Паразмаўляць з кім-небудзь у Літоўскім цэнтры не ўдалося: усё на замках. Ліпень — час адпачынкаў.

Спыняем машыну ля дому аднаго са старэйшых жыхароў вёскі — Рамуальда Рамойця. Нас папярэджвалі, што дзядуля мае складаны характар і можа не пагадзіцца паразмаўляць для газэты, але перасьцярогі былі марнымі.

Сп.Рамуальд адразу выклаў свой пункт гледжаньня адносна таго, як літоўцы аказаліся ў межах сёньняшняй Беларусі. «Раней жа тут заўсёды Літва была, пасьля прыйшлі палякі і забралі гэтыя землі сабе, пачалі вучыць, каб усё было папольску. У трыццатыя гады прыйшлі рускія, забралі сабе гэтыя землі, пачалі вучыць, каб усё было па-руску. Цяпер во ў Беларусі мы».

Сваю жыцьцёвую філязофію Рамуальд Рамойць выкладае нам на чысьцюткай беларускай мове, але зь відавочным літоўскім акцэнтам. «Дома па-мясцоваму размаўляем. Ня ведаю, ці літоўская гэта, ці не, але нешта падобнае. Нас беларусы па сёньня гергунамі называюць, бо лічаць, што мы не гаворым, а толькі «гергочам».

Жонка Рамуальда Марыя беларуска. Марыя расказвае, што сем гадоў не размаўляла па-літоўску, бо «саромелася», але пасьля пачала, так і гаворыць па сёньня.

Пытаюся, ці паказвае тут літоўскае тэлебачаньне. Кажуць, што так, але яны яго не глядзяць. «Калі толькі сьпевы якія вельмі харошыя паказваюць, то гляджу, а так мне Беларускага тэлебачаньня хапае», — кажа Рамуальд Рамойць. Ён таксама любіць Лукашэнку. Кажа, што заўсёды галасаваў за яго, будзе галасаваць і надалей. «У нас уся вёска за Лукашэнку», — не бяз гонару кажа дзядуля.

Дзеці Рамуальда і Марыі Рамойць таксама жывуць у Вільні. Бацькі кажуць, што іх нашчадкі там «уладкаваныя па поўнай праграме». Рамойці маюць беларускія пашпарты, толькі на перадапошняй старонцы, побач са штампам дазволу на выезд, стаіць іншы штамп: «Нацыяльнасьць — літовец».

Апошнім часам старым ня часта выходзіць наведаць Вільню. Каб зрабіць візу, трэба ехаць у літоўскае консульства ў Горадню, а гэта амаль 300 кілямэтраў, ды яшчэ візу за адзін дзень ніхто ня зробіць, да Менску езьдзіць было значна бліжэй. Дык некаторыя жыхары вёсак хітрасьцю маюць два пашпарты — і літоўскі, і беларускі.

Пераканаўшыся, што літоўскасьць у Рымдзюнах застаецца ўсур’ёз і надоўга, вырашаем скіравацца ў апошні пункт нашага падарожжа — Гервяты, найбуйнейшую зь мясцовых літоўскіх вёсак. Аднак Рамойць нас адразу папярэджвае, што асаблівай літоўскасьці ў Гервятах мы цяпер ня знойдзем. «Там ужо папалам літоўцаў і астатніх. Калі Чарнобыль выбухнуў, то прывезьлі туды нейкіх украінцаў, цяпер таксама ў гэты аграга-

**Працяг на старонцы 22.**



**Цэнтральную плошчу Гервятаў каталікі ператварылі ў французскі сад з скульптурамі.**

# Гергуны і гуды

**Працяг са старонкі 20.**



радок прывозяць з усяго сьвету», — кажа сп.Рамуальд.

## Гервяты

Ужо здалёк добра бачныя шпілі гервяцкага касьцёлу, аднаго з найвышэйшых у краіне.

Выгляд касьцёлу Сьвятой Тройцы ўражвае. Да таго ж, касьцёл патанае ў зеляніне. Папросту нейкі эдэмскі сад.

Практычна адразу сустракаем чалавека, які і спрычыніўся да гэтага хараства. Мужчыну завуць Віктар Ёдка, ён дапамагае мясцоваму ксяндзу. Кажа, што практычна ўсе кветкі і дрэўцы высаджваў сваімі рукамі, ніякай спэцыяльнай адукацыі ён ня мае, аднак усё прыжылося, у тым ліку і некаторыя экзатычныя віды расьлін.

Перад касьцёлам жа раскінулася вялізная плошча, цэнтральная плошча мястэчка, ператвораная ў французскі сад са скульптурамі. Сярод акуратна падстрыжанай травы пралеглі акуратныя дарожкі. Па пэрымэтры расстаўленыя скульптуры апосталаў. Унізе надпісы на літоўскай гаворцы «Piatrus», «Jakubu» і г.д.: Скульптуры набыць дапамаглі таксама літоўцы.

Віктар Ёдка кажа, што чатыры разы на тыдзень у касьцёле ладзяць літоўскія імшы. Сам Ёдка не літовец, але «добра ўжо навучыўся разумець службы па-літоўску».

Не літовец і ксёндз Леанід Нісьцюк. Па паходжаньні айцец Леанід беларус, але нарадзіўся ў Валгаградзкай вобласьці (Расея), служыў у флёце. Пасьля адчуў сьвятарскае пакліканьне, вучыўся ў Коўне, там і вывучыў літоўскую мову.

У касьцёл я патрапіў акурат у той момант, як там адбывалася вянчаньне. Мала-

«У нас уся вёска за Лукашэнку», — з гонарам кажа Рамуальд Рамойць.



дыя — Аляксандар і Іна — мясцовыя беларусы, таму і абрад ксёндз служыць… па-польску. Беларускіх службаў у Гервятах яшчэ няма.

Пакуль праходзіць вянчаньне, выходжу на двор. На касьцёльным цьвінтары знаходзяцца пахаваньні роду Дамейкаў. Тых самых, зь якіх паходзіць славуты навуковец Ігнат Дамейка.

Бабуля, што назірае праз плот за вясельнымі машынамі, прызнаецца, што не літоўка і нават ня ведае літоўскай мовы, хоць і пражыла тут усё жыцьцё. Літоўцаў тут засталося добра калі траціна, кажа. «Самі літоўцы іхнюю мову не разумеюць»,— сьмяецца баба Ганна.

Праўда, наступны мой суразмоўца аказваецца ўсё ж літоўцам. Яго завуць Мар’янам, асаблівага энтузіязму ў размове ён не праяўляе. На маё пытаньне, ці ёсьць у Гервятах нейкія літоўскія актывісты, якія клапоцяцца пра старыя звычаі і традыцыі, цікавяцца гісторыяй, дзед адказвае: «Усе мы тут актывісты». А пасьля раіць ехаць у Рымдзюны, калі мы насамрэч шукаем нейкай літоўскасьці, бо ў Гервятах мы яе мала знойдзем.

На звычайнай трасянцы гавораць у аграгарадзкім унівэрсаме «Янтарны», што насупраць касьцёлу.

І школы літоўскай тутака няма. Таму паціху і асымілююцца, страчваюць нацыянальныя рыскі. Разам з тым, практычна ўсе карэнныя вяскоўцы працягваюць запісваць сваіх дзяцей у пашпартах менавіта літоўцамі, бо бачаць для іх пэрспэктыву толькі ў суседняй краіне.

**Фота Андрэя Лянкевіча**

Том **«Беларусь: ні Эўропа, ні Расея»** зьмяшчае інтэрвію з трыццацьцю беларускімі палітыкамі, журналістамі, дзеячамі культуры і мастацтва, праведзеныя ўвесну 2006 году ў Менску. Нашым суразмоўцам былі зададзеныя дзевяць пытаньняў на тэму беларускай ідэнтычнасьці, узаемінаў Беларусі з Расеяй і Эўрапейскім Зьвязам. У выніку паўстаў зборнік, у якім пададзеныя разнастайныя і часам супярэчлівыя меркаваньні на вызначаную тэму.

Даслаўшы замову з пазначэньнем вашага імя, імя па бацьку і прозьвішча, а таксама дакладнага адрасу на адрас 220018, Менск, а/с 3, вы атрымаеце кніжку бясплатна. Просьба пазначаць мову, на якой замаўляецца выданьне: расейскую ці беларускую.

Вольга Абрамава, Сьвятлана Алексіевіч, Яўген Бабосаў, Анжаліка Борыс, Ірына Бугрова, Генадзь Бураўкін, Алесь Бяляцкі, Аляксандар Вайтовіч, Андрэй Вардамацкі, Вінцук Вячорка, Павал Данейка, Андрэй Дынько, Сьвятлана Калінкіна, Сяргей Калякін, Кася Камоцкая, Сяргей Касьцян, Вячаслаў Кебіч, Анатоль Лябедзька, Васіль Лявонаў, Жанна Літвіна, Алег Манаеў, Аляксандар Мілінкевіч, Анатоль Міхайлаў, Алесь Міхалевіч, Тацяна Працька, Андрэй Саньнікаў, Уладзімер Улаховіч, Валеры Фралоў, Станіслаў Шушкевіч, Усевалад Янчэўскі.

**Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт.** Варшава: Выдавецтва «ARCHE», 2006.

# Беларусь дазволіла сабе дапамагчы: урад ухваліў новыя праекты TACIC

Урад Беларусі ўхваліў шэраг мерапрыемстваў міжнароднай тэхнічнай дапамогі Эўразьвязу. Сярод зацьверджаных — праекты Рэгіянальнай праграмы дзеяньняў TACIC на 2006 год — такое паведамленьне прайшло ў СМІ. Чытач, пэўна, мог бы заблытацца — як так, калі на календары ўжо паўгоду 2007-ы, а ўхваленыя праекты за мінулы год. Насамрэч, гэта азначае, што рэгіянальная праграма была ўхваленая ў 2006 годзе і прадугледжвае рэалізацыю шэрагу праектаў, якія пачынаюцца ў 2007 годзе. Акрамя ўсяго, усе праекты рэгіструе ўрад, і працэдура рэгістарцыі займае багата часу.

## Што ўхвалена

Праект **«Спрыяньне рэалізацыі Кіёцкага пратаколу»**. Праект важны як для Беларусі, так і для краін-суседзяў. Ягоная мэта — разьвіцьцё тэхнічнага, інстытуцыйнага і чалавечага патэнцыялу ў Беларусі і ва Ўкраіне для праўядзеньня маніторынгу выкідаў парніковых газаў паводле міжнародных стандартаў. І, пры неабходнасьці, выкарыстаньня адпрацаваных у Эўропе мэханізмаў для зьменшэньня гэтых выкідаў.



Другі ўхвалены праект распрацоўваўся ў рамках Эўрапейскай ініцыятывы па дэмакратыі і правах чалавека і называецца **«Інфармацыйна-мэтадычны цэнтар праблем сям’і».** Вядзецца пра стварэньне цэнтру, які падтрымлівае рэалізацыю правоў дзяцей на адукацыю, у прыватнасьці, дапамогу для ўключэньня ў адукацыйны працэс дзяцей з асаблівасьцямі разьвіцьця.

Трэці праект — **«Аднаўленьне тэрыторый, што пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС, з выкарыстаньнем новых экалягічных тэхналёгіяў»** — будзе рэалізоўвацца ў рамках міжнароднай праграмы рэабілітацыі забруджаных тэрыяторый CORE. Фактычна, ён прадугледжвае ўвядзеньне новых тэхналёгіяў на ўзроўні прыватных падсобных гаспадарак, якія дазволяць сельскім жыхарам атрымліваць чыстую прадукцыю з найбольшым эканамічным эфэктам. Праект гэты павінен быў пачацца значна раней, але сваю ролю адыгралі цяжкасьці зь яго дзяржаўнай рэгістрацыяй. Дзяржава, нагадаем, рэгіструе кожны праект. Часам працэдура настолькі зацягваецца, што Эўракамісія вымушаная частку праектаў спыніць альбо спыніць фінансаваньне, бо крайнія тэрміны для пачатку рэалізацыі ўжо вычарпаныя. Больш за палову праектаў, якія Эўракамісія плянавала рэалізаваць у рамках CORE (на суму звыш мільёна эўра) адмененыя з-за невыкананьня тэрмінаў. На дадзеным этапе Эўракамісія рыхтуецца да рэалізацыі новага праекту сумесна з Праграмай Разьвіцьця ААН (UNDP), якая таксама ажыцьцяўляе постчарнобыльскую дапамогу.

Яшчэ два праекты (частка праграмы транспамежнага супрацоўніцтва і добрасуседзтва, накіраваная на павелічэньне дынамізму ўкаапэрацыі паміж памежнымі рэгіёнамі ЭЗ і Беларусі) — **«Стварэньне беларуска-латвійскага супрацоўніцтва ў сэктары дзіцячай паліатыўнай дапамогі» і «Мастацтва бязь межаў — папулярызацыя памежнай культурнай індустрыі праз мастацтва Марка Шагала і Марка Роткі».**

**Даведка**

Эўразьвяз зьяўляецца буйнейшым донарам тэхнічнай дапамогі для Беларусі, якая аказваецца праз Праграму тэхнічнага спрыяньня краінам СНД (TACIC). За гады дзеяньня TACIC у Беларусі рэалізавана 320 праектаў на суму каля 204 млн эўра, альбо больш за 40 адсоткаў ад усёй замежнай тэхнічнай дапамогі, што паступіла ў краіну з 1991 году.

Штогод у сярэднім Беларусь атрымлівае ад Эўразьвязу ў рамках TACIC тэхнічнай дапамогі на 15 мільёнаў эўра.

Рэспубліка Беларусь таксама ўцягнутае ў рэалізацыю трох праграмаў добрасуседзтва ЭЗ: «Польшча-Украіна-Беларусь», «Латвія-Літва-Беларусь» і «Рэгіён Балтыйскага мора».

Са студзеня гэтага году замест TACIC пачынае дзейнічаць новы мэханізм — праграмы добрасуседзтва і партнэрства.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
По дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu



# Каранацыя ў Гудагаі

Сьвяты абраз Маці Божай Гудагайскай шануюць ад 15 стагодзьдзя, калі невялікая выява Марыі была знойдзеная ў Ашмянскай пушчы. Яна пачала прыцягваць шматлікіх людзей, якія прыходзілі ў гэтае месца, каб памаліцца аб Божых ласках.

Ад пачатку 1990-х у Гудагай вярнуліся кармэліты босыя, якім раней належаў касьцёл. Яны і аднавілі традыцыю Гудагайскага фэсту. З кожным годам сюды прыходзіць усё болей і болей людзей: калі мінулыя гады ўсе набажэнствы праходзілі ў самім касьцёле, то сёлета насупраць храму, на адкрытым паветры, зрабілі вялікі амбон, на якім было напісана: «Табе, Маці, аддаём наш лёс».

У гэтым годзе фэст быў найбольш масавым, па розных падліках у ім узяло ўдзел ад 5 да 10 тысяч чалавек. Пілігрымы прыехалі зь Нясьвіжу, Віцебску, Менску, нават з Гомелю. Былі госьці зь Літвы, Латвіі, Польшчы, Італіі, Расеі. На фэст зьехалася каля 60 ксяндзоў і манахаў. Была дэлегацыя ад грэка-каталікоў, якую ўзначальваў айцец Андрэй Крот.

Цяпер ксяндзамі ў Гудагаі палякі, але яны зацята трымаюцца беларускасьці. Практычна ўсе набажэнствы сёлета на фэсьце праходзілі па-беларуску, толькі частка сьпеваў была па-польску. Падчас дзённай імшы ў суботу ксёндз зьвяртаўся да Маткі Божай: «Ніколі не пакідай нас, нават калі мы пакінем Цябе».

Прыкладна а 20-й, калі скончылася імша, сьвятары заклікалі людзей моўчкі маліцца ў касьцёле. У гэты самы час пачалі падыходзіць пілігрымы з разьмешчаных паблізу населеных пунктаў — Солаў, Ашмянаў, Смургоняў. Разам з ксяндзамі і клірыкамі, ішла моладзь. Сьпявалі пад гітару беларускія рэлігійныя песьні, гукалі «На Беларусі Бог жыве! Жы-ве! Жы-ве!» Толькі астравецкая пілігрымка сьпявала па-польску. Усіх паломнікаў на парозе касьцёлу сустракаў пробашч Казімер Мараўскі, ён, відавочна, радаваўся кожнаму госьцю.

Пасьля малітвы ў касьцёле пілігрымы разьбівалі намёты. Мясцовыя жыхары таксама прымалі гасьцей, хто колькі мог, ніхто не адмаўляў.

За гадзіну да поўначы пачалася сьвятая імша, якая вялася па-беларуску і дублявалася па-польску. Імша была ў касьцёле, але ўсе жадаючыя не маглі там зьмясьціцца, столькі было людзей. Частка слухала службу праз калёнкі на дварэ.

Працэсія са сьвечкамі затрымлівалася: спазьняўся ксёндз-генэрал ордэну кармэлітаў босых Люіс Арэстэгій Гамбоа, які толькі прыехаў з Ватыкану. За гэты час ксяндзы спавядалі вернікаў.

Толькі праз пятнаццаць-дваццаць хвілінаў пасьля поўначы пачалася працэсія. Папераздзе калёны чацьвёра ксяндзоў несьлі абраз, сьледам за імі са сьвечкамі ў руках ішлі вернікі. Уласна на працэсіі было каля 2—3 тысяч чалавек. Працэсія накіравалася ня толькі вакол касьцёлу, як мінулыя гады, але і ўпершыню вакол блізкіх могілак, каб «паказаць продкам нашу веру».

Дарога, якой ішлі людзі, да канца не заасфальтаваная, часам даводзілася пераскокваць камяні і ямы, але падаецца, што і гэтыя дробязі хутка тут будуць вырашаныя.

Ксёндз-генэрал Люіс Арэстэгій Гамбоа быў уражаны ўсім, што адбывалася ў Гудагаі. Генэрал кармэлітаў гаварыў пагішпанску, аднак ягоныя словы адразу перакладаліся на беларускую.

У нядзелю ў Гудагай прыехалі біскупы ўсіх беларускіх дыяцэзій, у тым ліку кардынал Казімер Сьвёнтак, быў апостальскі нунцый Марцін Відавіч. Яшчэ перад пачаткам гаміліі на цудоўнай беларускай мове выступіў арцыбіскуп маскоўскі Тадэвуш Кандрусевіч, ён адзначыў, што сваю вядомасьць ён заслужыў менавіта ў гэтых мясьцінах.

У адрозьненьне ад Будслаўскага фэсту, Гудагайскі наведваюць і прадстаўнікі ўлады. У другі дзень з амбону выступаў старшыня Гарадзенскага аблвыканкаму Ўладзімер Саўчанка, які гаварыў пра тое, наколькі важны гэты фэст для адраджэньня духоўнай спадчыны нашай краіны. Быў зачытаны ліст ад упаўнаважанага па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Леаніда Гулякі. Не абмінуў фэст і старшыня астравецкага райвыканкаму Кавалько.

Казімер Сьвёнтак адзначаў, што да ўсіх каранаваных у Беларусі абразоў ён мае непасрэднае дачыненьне. Кульмінацыяй фэсту сталася сама каранацыя абразу Маці Божай Шкаплернай Папскай Каронай. Грошы на золата для дзьвюх каронаў (адна — для Панны, другая — маленькаму Езусу) зьбіралі местачкоўцы, рабілі кароны польскія ювэліры, а асьвяціў Папа Рымскі.



Кароны вынесьлі высьвечаныя ў манахі-кармэліты родныя брат і сястра. Як толькі адбылася каранацыя, загучаў сьпеў «Сальвэ рэгіна», які выконваў хор менскага Чырвонага касьцёлу. На розных мовах (беларускай, польскай, літоўскай, расейскай, латыні) прагучала малітва бласлаўленьня.

Дзесьці а трэцяй пробашч касьцёлу ксёндз Казімер Мараўскі падзякаваў усім, хто сабраўся ў Гудагаі, а таксама заклікаў прыяжджаць на наступныя гады.

**Зьміцер Панкавец,**
**фота Андрэя Лянкевіча**
**Гудагай – Менск**



# Фэстывалю вярнулі «Малітву»

Пра фэст духоўнай музыкі «Магутны Божа» з Магілёва піша **Міхась Булавацкі**.

Амаль адначасова зь віцебскім «Славянскім базарам» у Магілёве прайшоў XV фэстываль духоўнай музыкі «Магутны Божа». Разнастайная дзевяцідзённая праграма папоўнілася нават некаторымі сьвецкімі элемэнтамі. Фурор выклікалі «Віртуозы Масквы», якія пад кіраўніцтвам Г.Гараняна сыгралі і некалькі джазавых кампазыцыяў; моладзевы аркестар з гораду Асьці (Італія) і яго саліст з чароўным голасам Мікелянджэла Пэпіна; тэатар беларускай драматургіі зь Менску з рок-опэрай «Адвечная песьня».

«Віртуозы» наведалі Магілёў ужо другі раз. Першы раз, некалькі гадоў таму, маэстра Сьпівакоў адгукнуўся на цёплую просьбу аднакурсьніка У.Браілоўскага, тагачаснага дырэктара Магілёўскай філярмоніі і ініцыятара «Залатога шлягеру», і прывёз у Магілёў сваю групу з багатай канцэртнай праграмай. Цяпер У.Браілоўскі адбывае тэрмін у месцах ня дужа аддаленых, і, можа, з гэтай прычыны сам Сьпівакоў не прыехаў.

На адкрыцьці фэстывалю мэр Магілёва В.Шорыкаў аддаў належнае ініцыятарам і ранейшым яго арганізатарам, адзначыўшы добрым словам і граматай гарвыканкаму тагачаснага ксяндза Ўладзіслава Бліна ды іншых дзеячаў, што зрабілі істотны ўнёсак у фэстываль.

Асабліва прыемна было глядзець, як сказаць добрае слова фэстывалю на сцэну падымаюцца поруч япіскап Сафроній і прадстаўнікі Ватыкану. Фэстываль, ініцыяваны Касьцёлам, праваслаўная Царква напачатку сустрэла нядобразычліва, і працяглы час праваслаўныя сьвятары на фэстывалі не паказваліся. Прыемна ўразіла і дэпутат палаты Натальля Аўдзеева: яна цудоўна прасьпявала купалаўскую «Малітву»:

«Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Расьпятаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі зь мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй...»

Гадоў сем-восем таму яна, будучы чыноўніцай гарвыканкаму, на вячэрніх моладзевых тусоўках такога ж фэстывалю ганялася за хлопцамі і дзяўчатамі, спрабуючы адабраць у іх бел-чырвона-белыя сьцяжкі. Нешта мяняецца, калі яна запела сваім прыгожым голасам пра расьпятую душу.


CATHOLIC.BY

Але галоўны сымбаль і гонар фэстывалю — «Малітва» Н.Арсеньневай і М.Равенскага.

На адным зь першых фэстываляў «Магутны Божа» мяне бязьмерна ўсхвалявала і ўразіла гэтая дзея, калі пад канец яго ўрачыстага адкрыцьця на сцэну выйшлі ўсе хоры, усе сьпевакі і музыкі, якія адкрывалі фэстываль, хто не зьмясьціўся на сцэне — пайшлі ў праходы залі і нават на балькон, і пад уладарна-велічным кіраваньнем Уладзімера Роўды ўся заля засьпявала «Магутны Божа! Ўладар сусьветаў, вялікіх сонцаў і сэрц малых! Над Беларусяй, ціхай і ветлай рассып праменьні свае хвалы...» З гледачоў сьпявалі тады нямногія, слоў ня ведалі. Але сьпявалі харавыя калектывы і сьпевакі ня толькі зь Беларусі, сьпявалі польскія, расейскія, украінскія хоры (калі й вывучыць пасьпелі!) і гімн-малітва гучала так, што Бог яе ня мог не пачуць. Больш такога супольнага ўрачыстага сьпяваньня «Малітвы» мне чуць не даводзілася, але, тым ня менш, яна велічна гучыць кожны раз пры адкрыцьці і закрыцьці фэсту.

Калі фэстываль узяў пад патранаж гарвыканкам, была спроба адмовіцца ад «Малітвы». Напачатку паспрабавалі замяніць жывое сьпяваньне «фанэрным». Так, аднойчы фэстываль закрывалі пад тэхнічнае гучаньне мэлёдыі М.Равенскага бяз слоў Н.Арсеньневай. Гледачы зьдзіўлена пераглядваліся, нарэшце адзін не ўтрымаўся і закрычаў «Роўду на сцэну!» Яго спрабавалі супакоіць, але ён гучным голасам паўтараў, перакрыкваючы «фанэру»: «Роўду на сцэну!!! Роўду на сцэну!!!..» Па заканчэньні фэстывалю ў гарвыканкам пайшлі лісты з патрабаваньнямі вярнуць «Малітву» фэстывалю. І «Малітву» вярнулі.

Вось і на гэты раз, калі на сцэну выйшлі розныя харавыя калектывы, і вядучая запрасіла маэстра Роўду, уся заля ўстала і тры разы прасьпявала «Малітву». Закрываўся фэстываль пад тую ж «Малітву», толькі ўжо ў выкананьні Магілёўскай гарадзкой капэлы пад кіраўніцтвам Сяргея Лішчэнкі. Фэстываль дапамагае вярнуць Бога ў душы людзей. Мо тым і ўратуемся...

*Магілёў*

## КАЛЯНДАР

## Жнівень

**6** — 50 гадоў таму (1957) нарадзіўся тэатральны рэжысэр Мікалай Пінігін.

**7** — 75 гадоў з дня нараджэньня Адама Мальдзіса, літаратуразнаўца, крытыка, празаіка, публіцыста, грамадзкага дзеяча (1932).

**15** — Прачыстая (Сплененьне) у каталікоў.

**15** — 625 гадоў таму (1382) у Крэве быў задушаны Кейстут, вялікі князь літоўскі.

**19** — Яблычны Спас у праваслаўных.

**28** — Прачыстая (Сплененьне) у праваслаўных.

**29** — 375 гадоў таму нарадзіўся ангельскі філёзаф Джон Лок.

## У Нью-Ёрку пахавалі паліцыянта Цімашэнку — ураджэнца Беларусі

На Мараўскіх могілках у Стэйтан-Айлэндзе адбылося пахаваньне 23-гадовага паліцыянта, ураджэнца Бабруйску, Расэла (Руслана) Цімашэнкі. 9 ліпеня Расэл спрабаваў спыніць машыну са злачынцамі, аднак быў расстраляны ў твар.

«Гэта ўжо дзявяты выпадак у час майго знаходжаньня на пасадзе мэра, калі злачынцы забіваюць паліцыянта. Я зраблю ўсё, каб у часе маёй далейшай працы не адбылося дзясятага пахаваньня», — сказаў мэр Нью-Ёрку Майкл Блумбэрг.

Імёны забойцаў былі абʼяўленыя ў акружным судзе. Гэта афраамэрыканцы Дэкстэр Бостык, Робэрт Эліс і Лі Вудз, якія належаць да адной з крымінальных груповак.

На разьвітаньне з Расэлам прыйшлі сотні ўдзячных яму жыхароў Нью-Ёрку.



## Упершыню перамаглі кіпрыётаў

Напярэдадні другога матчу першага кваліфікацыйнага раўнду Лігі чэмпіёнаў практычна ніхто не прагназаваў перамогі барысаўскага БАТЭ. Аднак упершыню ў гісторыі супрацьстаяньняў камандаў зь Беларусі і Кіпру перамаглі нашы суайчыньнікі: 3:0. У наступным раўндзе Лігі чэмпіёнаў найхутчэй супернікам БАТЭ будзе клюб «Хафнафʼёрдзюр» з далёкай Ісьляндыі. Барысаўцам пашанцавала — ёсьць рэальная магчымасьць прайсьці далей.

## 190 чалавек заразіліся цэркарыёзам на Нарачы

Гэтае захворваньне характэрнае для Нарачы (**на фота справа**), бо там шмат вадаплаўнага птаства. У памёце яго і размнажаюцца лічынкі цэркарыяў. Яны жывуць у цяпле, на мелкай вадзе. Гадуюцца на малюсках. Хвароба не пагражае жыцьцю чалавека, бо цэркарыі пад скурай гінуць. Але ж месцы, куды яны пранікаюць, сьвярбяць. Каб не захварэць, мусова адразу пасьля плаваньня прымаць душ.

## Навукоўцы з БДУ разгадалі мову насякомых

На лясным масіве, у спэцыяльна разьвешаных плястыкавых пастках ляжалі шкоднікі лясоў, што патрапілі туды, — шаўкапрады. Усе выключна мужчынскага полу. Яны ляцелі на прызыўны пах самак свайго віду. Тое, што шаўкапрады прынялі за сыгнал для знаёмства, было ня што іншае, як пах сынтэзаванага ў лябараторыі хімфаку БДУ фэрамону.

Цяпер праходзяць выпрабаваньні фэрамонныя прэпараты для барацьбы з сасновым шаўкапрадам і пілільшчыкамі.

## І ў Лідзе пабудуюць лядовы палац

Лядовы палац паўстане на вуліцы Качана паміж рынкам «Старт» і былой будынінай завода «Ізатрон». Ён будзе разьлічаны на 1200 месцаў.

## У Беларусі знайшлі свой Стоўнхендж

Знойдзенае паблізу ад Воршы (Віцебская вобласьць) каменнае збудаваньне можа быць старадаўняй абсэрваторыяй або капішчам, лічаць удзельнікі першай навуковай экспэдыцыі ва ўрочышчы Купа, арганізаванай Інстытутам гісторыі АН. Узначальваў экспэдыцыю кандыдат гістарычных навук Эдвард Зайкоўскі.

На схіле берагу Дняпра дасьледчыкі знайшлі каля 40 валуноў. У цэнтры комплексу ўзвышаецца вялікі камень дыямэтрам каля двух мэтраў. Астатнія дыямэтрамі 0,6-0,9 мэтра ствараюць вакол яго два колцы.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## У Парыжы дапыталі былога прэзыдэнта

Былы прэзыдэнт Францыі Жак Шырак быў выкліканы на допыт у сувязі са скандалам вакол фінансаваньня Кансэрватыўнай партыі падчас яго знаходжаньня на пасадзе мэра Парыжу. Гаворка ідзе пра незаконныя выплаты сябрам партыі ў гэты пэрыяд. 12 год у часе прэзыдэнцтва Шырак карыстаўся імунітэтам і ня мог быць дапытаным.

## Рэфэрэндум аб сіесьце

Нацыянальная выбарчая камісія Вугоршчыны ўхваліла ідэю рэфэрэндуму пра ўвядзеньне ў краіне сіесты (паабедзеннага адпачынку). Ініцыятыўная група павінна сабраць 200 тыс. подпісаў. Ініцыятыўная група таксама прапаноўвала закон пра тое, што рэстараны павінныя бясплатна наліваць піва ў сьпёку. Але Цэнтарвыбаркам ідэю заваліў. З 1989 г. у Вугоршчыне былі праведзеныя толькі два рэфэрэндумы — пра ўступленьне ў NATO і ЭЗ.

**Зьміцер Панкавец, МБ; паводле Радыё Свабода, BBC, gazeta.ru, «Звязда», Радыё Рацыя, БелаПАН**

# Лепім разам!

Сёньня будзем ляпіць сьлімака.



Спачатку зьлепім цела сьлімака зь зялёнага плястыліну.



Потым возьмем кавалак жоўтага ды аранжавага плястыліну і скатаем дзьве кілбаскі, завостраныя з аднаго боку.



Скруцім кілбаскі разам, нібыта касічку.






Згорнем касічку, каб атрымалася ракавінка. Скатаем зь белага плястыліну шарыкі-вочкі.






Зробім з плястыліну маленечкую кілбаску-роцік.



Прылепім ручкі.



Атрымаўся
вясёлы
сьлімак!

Капітан Танака ©

http://www.tanakaland.org

## НІНА МАЦЯШ

ПАКУТНІЦА

*(З цыклу «Людзі майго жыцьця»)*

Нэрвы не пад скураю — паўзьверх...
Выбухаеш ад любога дотыку.
Нават спачувальны рух насустрач
азываецца ў табе нясьцерпам.

Шчырая, —
цяпер ты за прытворства!

Добрая, —
цяпер за чэрствасьць ты!

Ашуканая ў найлепшых марах, —
мучыся і мучыш падазрэньнем.

Бачысься сама сабе ахвярай, —
а пакутуюць усе навокал.

Поўная спагаднае любові, —
паўстаеш ужо й супроць яе!..

Што ж гэта, жыцьцё, ты робіш з намі?..

Што з жыцьцём сваім мы робім самі?..



**У 2007 годзе, годзе 125-годзьдзя Купалы і Коласа, «НН» штонумар друкуе творы беларускіх паэтаў. У ранейшых нумарах пабачылі сьвет творы Генадзя Бураўкіна, Андруся Храпавіцкага, Юрася Пацюпы, Міхала Анемпадыстава, Сяргея Прылуцкага, Сяргея Сыса, Алеся Макрацова ды іншых аўтараў. Чакаем Вашых твораў.**




ЗЬБЯРЫ КНІГАРНЮ «НАША НІВА»

# Паветраны шар

У кнігу ўвайшлі найлепшыя мужчынскія апавяданьні 1991 —2007 гадоў у выбарцы «Нашай Нівы». Гэта апавяданьні Вячаслава Адамчыка, Аляксандра Апона, Арцёма Арашонка, Уладзімера Арлова, Ігара Бабкова, Аляксея Бацюкова, Васіля Быкава, Лявона Вольскага, Адама Глёбуса, Леаніда Маракова, Сяргея Мацёрага, Вінцэся Мудрова, Уладзімера Някляева, Сержука Сокалава, Сяргея Шыдлоўскага і іншых — усяго 30 аўтараў.

**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне / Вячаслаў Адамчык, Аляксандар Апон, Арцём Арашонак і інш. Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 334 с. (Кнігарня «Наша Ніва»)

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Менск, якога няма



**Апошні тыдзень — да 31 ліпеня — у Галерэі Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава «Менск, якога няма», прысьвечаная гісторыі стварэньня аблічча сучаснага Менску. Менск паваенны, Менск адноўлены — у творах жывапісу і графікі Сяргея Каткова, Івана Дмухайлы, Генрыха Ціхановіча, Міхаіла Даўгялы, Уладзімера Стэльмаха, Барыса Гераўкера…**

## КАНЦЭРТЫ

**Добрыя мысьлі**

1 жнiўня ў фальварку «Добрыя мысьлі» (вул. Магілёўская, 12) адбудзецца канцэрт музыкі і выканаўцы Сяргея Дальчаніна. Пачатак а 19-й. Т.: Т.: 8-029-660-40-20, 769-64-59

**Сандалі на лета**

У клюбе «Графіці» працягваецца міні-фэст пад закрытым небам «Сандалі на лета». 26 ліпеня Сяргей Пукст і Міхей «Сып» зайграюць трэш. 27 ліпеня — блюзавы дзень. Будуць Cross.B.Band і спэцыяльны госьць. Замова месцаў і даведкі: 17-999-18, 77-999-18, (029) 278-32-16. Адрас: зав. Калініна, 16.

## ВЫСТАВА

**Зоя Луцэвіч**

У клюбе «Ізюм» (пр. Незалежнасьці, 25) працуе выстава карцін Зоі Луцэвіч. Творы Зоі Луцэвіч выстаўляліся ня толькі ў Беларусі, але і ў Расеі, Баўгарыі, краінах Балтыі, Польшчы, Нямеччыне, Аўстрыі, ЗША. Кожная яе выстава карыстаецца нязьменным посьпехам і непрыхаванай цікавасьцю сярод аматараў жывапісу. Цяпер лепшыя працы мастачкі здолее паглядзець і ацаніць кожны наведвальнік «Ізюму».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Гары Потэр і Ордэн Фэнікса». Казачныя падпольшчыкі супраць цёмных сілаў

У новай карціне паводле раману Джаан Роўлінг — суворыя прыгоды, пасталелыя героі — … і беларускія рэаліі.

**Гары Потэр і Ордэн Фэнікса**
(Harry Potter and the Order of the Phoenix)

Вялікабрытанія — ЗША, каляровы, 138 хв.

**Рэжысэр:** Дэйвід Етс

**Ролі выконваюць:** Дэніэл Рэдкліф, Рупэрт Грын, Эма Уотсан, Імэльда Стаўнтан, Эвана Лінч, Ралф Файнз, Гары Олдмэн, Алан Рыкмэн, Хелена Бонэм-Картэр, Робэрт Гардзі, Эма Томпсан

**Жанр:** Фантазійна-казачныя прыгоды паводле аднайменнай кнігі Джаан Роўлінг

Адзнака: 6,5 (з 10)

Гары Потэра абвінавачваюць у хлусьні. У Міністэрстве магіі ня вераць, што Цёмны Лорд вярнуўся. Міністар Фадж (Робэрт Гардзі) засылае ў чарадзейную школу Хогвардз салодкагалосую Далорэс Амбрыдж (Імэльда Стаўнтан), якая пільнуе, каб школа адпавядала дзяржаўнай ідэалёгіі. Бюракратка Амбрыдж распускае ўсе вучнёўскія гурткі, уводзіць паліцэйскі рэжым і забараняе свабодныя думкі.

Але насуперак перашкодам Гары Потэр арганізуе атрад, дзе школьнікі вучацца абараняцца ад злых сілаў. Неўзабаве ім прыйдзецца сутыкнуцца з бандай Валяндэморта…

Карціна малавядомага Дэйвіда Етса пазбаўленая змрочна-іранічных інтанацый Альфонса Куарона («Гары Потэр і вязень Азкабану»). Яна далёкая й ад камічнай казачнасьці Крыса Калямбуса (першыя часткі Потэра). Пятая сэрыя — гэта Высокая Фабрыка, дзе кожны складнік фільму выверaны на канвэеры (вынікі настолькі спадабаліся прадусарам, што Етса запрасілі на наступную сэрыю).

Карціна багатая на трапныя акторскія жэсты. Грымаса прафэсара Снэйпа (Алан Рыкман), трагічны позірк Гары Олдмэна, задумлівасьць Луны Лавгуд (Эвана Лінч). А гратэскнай гістэрыкі Хелены Бонэм-Картэр, якая зьяўляецца ў кадры на некалькі хвіляў, забыць немагчыма. Што да Імэльды Стаўнтан, то створаны ёю вобраз ціхмяна-злоснай сьцервы — нат пераўзыходзіць кніжны арыгінал.

Ашаламляльныя дэкарацыі, бойка ў Міністэрстве магіі — карціне хапае адмысловых эфэктаў, але акцэнт зроблены на псыхалягічных момантах. Героі сталеюць — і цяпер ужо самастойна, без аглядкі на дарослых, ідуць на двубой са злом.

Калі выйшла пятая кніга пра Гары Потэра, вучні забароненага Беларускага ліцэю пісалі Джаан Роўлінг, што гэта кніга — пра іх. Цяпер на экране мы бачым аўтарытарнае глупства, «ідэолягаў», страх, які скоўвае душу, — і непазьбежную перамогу дабра над злом.

Перамога гэтая даецца цяжка (маленькіх дзяцей у кінатэатар лепей ня браць — зьлякаюцца); але хто сказаў, што казка — толькі намёк?

**Андрэй Расінскі**



# З СССР у Беларусь

Гіры—Рымдзюны—Гервяты. Рэпартаж зь беларуска–літоўскіх вёсак Астравеччыны. Піша **Зьміцер Панкавец**.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З-пад Лукомля Магілёўскай губ.** Адзін мужык падвозіў з кірмаша мужыка з суседняй вёскі. Хадзіла чутка, што той сусед — «дэмакрат». Як яны ехалі цераз лес, сустрэлі іх стражнікі і патрэбавалі, каб наш мужык ссадзіў з воза таго «дэмакрата» і сам барджжэй ехаў. Той перапалохаўся і, аддаўшы стражнікам «дэмакрата», давай сам «ратаваць душу», як казаў прыехаўшы дахаты. А стражнікі так памялі таго «дэмакрата», што ён калі і паправіцца, то, небарака, навек астанецца калекаю, бо яму саўсім вывярнулі руку і нагу. – Цяпер тут кожны мужык жыве ў страху.

**Тутэйшы.**
**«Наша Ніва». №27. 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

Віншуем Сямёна
і Тацяну Печанкоў
з шлюбам!
Шчасьця і каханьня!

**Нашаніўцы**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем** шаноўную Алу Міхайлаўну Ходан з 70-гадовым Юбілеем! Здароўя, доўгіх гадоў жыцьця і божай ласкі Вам. Вялікі дзякуй за працу «Беларускай хаткі», за любоў і шчырую адданасьць беларускаму слову. Жыве Беларусь! Сябры «Беларускай хаткі»

### ШПАЦЫРЫ

**Ад 18 гадзінаў шточацьвер** ў Віцебску беларускамоўныя шпацыры ў наваколлі Дабравешчанскай царквы.

### КНІГІ

**Абмен культуралягічнай інфармацыяй**, кнігамі. Дашлю сьпіс прапаноў. Канфэрэнцыі, літаратурныя вечарыны, выдавецкія праекты. Ад Вас — капэрта са зваротным адрасам. А/с 195, 220030, Менск. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

### СПАЧУВАНЬНІ

**Спачуваньні Зьмітру** Саўку ў сувязі зь ягоным горам — сьмерцю бацькі — праз сайт nn.by выказалі Ігар Л., Алесь Т., Адам Шпакоўскі, Ігар Хляба, Віталь Сіліцкі.

## ЖАРТ

Вытворчае аб’яднаньне «Гарызонт» наладзіла выпуск фенаў. Беларускі фен запраграмаваны на тры рэжымы: БТ, АНТ і «Лад».


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.07.2007.
Замова № 4020.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.